№№153–154
(2881–2882)

10 кастрычніка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ДУПЛЕТ

Вось і сустрэліся два Аляксандры

Першы за шмат гадоў высокі еўрапейскі чыноўнік наведаў Мінск. У аўторак на адзін дзень да нас завітаў дзейны старшыня АБСЕ, міністр замежных спраў Фінляндыі Аляксандр Стуб.

13 кастрычніка ў Люксембургу кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў краін Еўрасаюза павінны прыняць рашэнне аб тым, ці здымаць з Беларусі санкцыі, ці пакінуць іх у сувязі з тым, што парламенцкія выбары ў нашай краіне не адпавядалі еўрапейскім стандартам. Аляксандр Стуб прыляцеў у Мінск, каб скласці асабістае ўражанне, ці варты Мінск "авансу".

Няцяжка здагадацца, што ні слова пра вынікі сваіх сустрэч з Аляксандрам Лукашэнкам і міністрам замежных спраў нашай краіны Сяргеем Мартынавым прадстаўнік АБСЕ не сказаў. Але літаральна з некалькіх цытат можна здагадацца пра сэнс размоў.

Аляксандр Лукашэнка: *"Мы цалкам адэкватныя людзі і гатовыя вучыцца там, дзе можам навучыцца. Калі Еўрасаюз хоча, каб цэнтр Еўропы быў у Еўропе, то трэба здымаць усялякія заслоны".*

Аляксандр Стуб: *"Час перагарнуць старонку ў дачыненнях Беларусі і Еўропы. Мы адчуваем, што пасля крызісу ў Грузіі баланс перамясціўся на ўсход. Унутры Еўрасаюза правільныя настроі, што Беларусь рухаецца ў правільным кірунку. Гэта асноўны падыход, які я прывёз у Беларусь. Выбары — гэта адчувальнае пытанне. Ніхто не можа адкінуць тое, што былі пазітыўныя зрухі ў 2008 годзе параўнальна з 2000-м і 2004 гадамі".*

Аляксандр Лукашэнка: *"За сказанае вамі мы гатовы прагаласаваць, каб вы былі пажыццёвым старшынёй АБСЕ".*

Як кажуць, без каментарыяў...

Каму ў Беларусі жыць добра?

Сталявары БМЗ маюць заробкі, эквівалентныя 1,5—2 тысячам долараў.

Пра гэта расказала журналістам намеснік генеральнага дырэктара РУП "Беларускі металургічны завод" Надзея Гаркуша. *"І гэта не мяжа,* — дадала яна. — *Мы на прадпрыемстве імкнёмся пастаянна павялічваць заработную плату".*

Тым часам у Гродне пачалі шукаць тых, хто атрымлівае зарплату такую ж, як сярэдняя па краіне — 500 долараў. Хлопцы, не шукайце! Жлобін даў краіне сярэдні паказчык. У вас 200 долараў, у іх — 2 тысячы, вось і атрымліваецца ў сярэднім 1100. І ніякага падману!

Еўропа распачала кансультацыі з беларускай апазіцыяй

На гэтым тыдні лідэры дэмакратычных колаў Беларусі выступілі ў Еўрапарламенце. На бліжэйшы час запланавана сустрэча з міністрам замежных спраў Польшчы Радаславам Сікорскім.

У Брусель на абмеркаванне рэзалюцыі па сітуацыі ў Беларусі былі запрошаны экс-кандыдаты ў прэзідэнты Аляксандр Казулін і Аляксандр Мілінкевіч, а таксама намеснік старшыні Руху "За Свабоду" Віктар Карнеенка і сустаршыня ствараемай партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" Павел Севярынец.

Перад выступленнем у Еўрапарламенце Аляксандр Казулін правёў сустрэчы ў фракцыі сацыялістаў, а Аляксандр Мілінкевіч, Віктар Карнеенка і Павел Севярынец мелі размову з дэпутатамі фракцыі Еўрапейскай народнай партыі/Еўрапейскіх дэмакратаў.

На 10 кастрычніка была запланавана сустрэча лідэраў беларускай апазіцыі з міністрам замежных спраў Польшчы Радаславам Сікорскім. Папярэдне было агучана, што гаворка на сустрэчы пойдзе пра вынікі парламенцкіх выбараў, а таксама далейшыя шляхі супрацоўніцтва польскага ўрада з Беларуссю. Прычым у дэлегацыю з беларускага боку акрамя Аляксандра Казуліна і Аляксандра Мілінкевіча ўвайшлі чатыры сустаршыні АДС — Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Сяргей Калякін і Анатоль Ляўковіч, а таксама старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі. Аднак, па словах Аляксандра Казуліна, у апошні момант стала вядома, што сустрэча перанесена на больш позні тэрмін.

Акрамя таго, трэба ўзгадаць, што 2 кастрычніка ў Варшаве кіраўнік Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч сустракаўся са старшынёй Еўрапейскага парламента Гансам-Гертам Пётэрынгам і старшынёй камісіі па міжнародных справах Еўрапарламента Яцэкам Сарыюшам-Вольскім. На сустрэчы таксама абмяркоўвалася палітычная і эканамічная сітуацыя ў Беларусі, а таксама мінулая парламенцкая выбарчая кампанія.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

Балеем за нашых!

Усе квіткі на футбольны матч Беларусь—Англія прададзеныя яшчэ на мінулым тыдні. Пра гэта паведамляюць у касах стадыёна "Дынама".

Нагадаем, што матч пройдзе на мінскім стадыёне "Дынама" 15 кастрычніка. Пачнецца ён у 21.30. Стадыён змяшчае 34 тысячы чалавек. Спецыяльна на гульню прыедуць футбольныя заўзятары з Вялікабрытаніі.

ПАЛІТКУХНЯ

Раскол

"Малады фронт" страсаюць скандалы

У незарэгістраванай маладзёжнай арганізацыі "Малады фронт" — чарговая хваля разборак...

Усё распачалося з таго, што ў аўторак прэс-служба арганізацыі распаўсюдзіла інфармацыю аб тым, што былы палітвязень **Артур Фінькевіч** зняты з пасады намесніка старшыні "Маладога фронту" нібыта *"за дзеянні, накіраваныя на дыскрэдытацыю "Маладога фронту"*. Рашэнне прымалася соймам арганізацыі, і старшыня "Маладога фронту" **Дзмітрый Дашкевіч** пракаментаваў яго так: *"Перад адхіленнем ад пасады намесніка старшыні Артуру неаднаразова прапаноўвалася агучыць свае планы: ці гэта амбіцыі заняць пасаду старшыні, ці гэта жаданне ствараць іншыя арганізацыі. Адмаўляючыся ад гэтых дзеянняў і памкненняў, Артур працаваў над імі таемна, з дапамогай інтрыг і змоў..."*

Намеснік старшыні "Маладога фронту" **Іван Шыла** дадае наступнае: *"Калі ж стала зразумела, што большасць маладафронтаўцаў не падтрымлівае амбіцыі і інтрыгі Артура і ягоных таварышаў, яны пачалі працу па стварэнні фіктыўнай арганізацыі "Моладзь за Беларусь"*.

Чаму Іван упэўнены, што новая арганізацыя будзе *"фіктыўнай"*, не зразумела. Але скандал разгарэўся недзіцячы.

Артур Фінькевіч сітуацыю, якая склалася ў "Маладым фронце" і прывяла да скандалаў, патлумачыў "Народнай волі" так:

— Апошнім часам з дэмакратычнага руху Беларусі прыбіраюць актыўных людзей. Варта прыгадаць і Аляксандра Казуліна, і Алеся Міхалевіча... Тое ж самае адбываецца і ў "Маладым фронце". Не сакрэт, што ўнутры арганізацыі маюцца супярэчнасці і разыходжанні ў бачанні шляхоў развіцця арганізацыі. На сённяшні дзень я лічу вельмі важным стварэнне шырокага і моцнага маладзёжнага руху. А "Малады фронт" замест таго, каб пашырацца, тоне ў нейкіх унутраных разборках. З арганізацыі выжываюць тых, хто не падзяляе бачанне шляхоў развіцця арганізацыі, якое прапаноўваецца Змітром Дашкевічам. Мне "прад'явілі" раскол "Маладога фронту" таму, што я хачу, каб арганізацыя пашыралася і развівалася...

Зразумела, Фінькевіч не прызнае абвінавачванняў у тым, што апускаўся да подкупу некаторых сяброў "Маладога фронту". *"Мне шкада, што людзі такое гавораць",* — дадае ён. І, між іншым, у Фінькевіча ўзніклі сумненні наконт законнасці ягонага зняцця з пасады: *"На пасаду старшыні мяне абіраў з'езд і, як я разумею, толькі з'езд мог мяне і зняць..."*

Літаральна праз пару гадзін пасля таго, як стала вядома аб адхіленні ад пасады Фінькевіча, пабачыла свет так званая *"заява 22-х"*. Яе аўтары і падпісанты — лідэры і актывісты рэгіянальных суполак "Маладога фронту". У заяве, у прыватнасці, адзначаецца: *"Мы, актывісты "Маладога фронту", кіраўнікі абласных і раённых структур, заяўляем, што апошнія працэсы ўнутры нашай арганізацыі ідуць уразрэз са статутнымі палажэннямі, мэтамі і задачамі "Маладога фронту". Лічым гэтую сітуацыю ненармальнай і выкліканай недэмакратычнымі паводзінамі кіраўніка арганізацыі Дзмітрыя Дашкевіча. У мэтах прадухілення расколу аганізацыі, усведамляючы асаблівую ролю "Маладога фронту" ў найноўшай гісторыі Беларусі, кіруючыся статутнымі палажэннямі, мы заяўляем аб прыпыненні паўнамоцтваў Дзмітрыя Дашкевіча на пасадзе старшыні "Маладога фронту", а таксама ўсіх намеснікаў да бліжэйшага з'езда арганізацыі і заклікаем усе структуры прыняць гэтае рашэнне, а ўжо на шырокім з'ездзе абраць годнага кіраўніка".*

Адной з тых, хто падпісаў заяву, стала экс-старшыня магілёўскай суполкі "Маладога фронту" **Таццяна Буланава**. Вось яе погляд на сітуацыю.

— Канфлікт паміж Дашкевічам і Фінькевічам пачаўся не ўчора, —расказвае Таццяна. — У хлопцаў і сапраўды рознае бачанне развіцця арганізацыі. У нядзелю ў Магілёве адбыўся сход мясцовага актыву арганізацыі. Дарэчы, наша рэгіянальная суполка — самая масавая ў краіне. На сустрэчы прысутнічалі і Фінькевіч з Дашкевічам. Сход аднагалосна прагаласаваў за тое, каб Фінькевіч мог вылучацца на пасаду старшыні на будучым з'ездзе. Я таксама сказала Дашкевічу, што падтрымаю менавіта Артура. Зміцер сказаў, што калі так, то я для яго вораг. А літаральна праз дзень я даведалася, што ў Мінску прынята рашэнне аб адхіленні мяне ад пасады старшыні магілёўскай суполкі. Таму і была напісана гэтая заява, і, натуральна, усе, хто яе падпісаў, не лічаць Дашкевіча старшынёй...

У сваю чаргу Зміцер Дашкевіч не прызнае правамоцнасць заявы, называючы яе *"правакацыяй"*.

З'езд незарэгістраванага "Маладога фронту" запланаваны на 25 кастрычніка. Ён, думаецца, і расставіць кропкі над "і".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ТЫМ ЧАСАМ

Заснавальнік і першы кіраўнік "Маладога Фронту" Павел Севярынец адзначае, што цяперашні крызіс у арганізацыі далёка не першы. Нават пры старшынстве Севярынца такіх крызісаў было шэсць. Палітык сцвярджае, што ўсе падобныя крызісы інспіраваліся спецслужбамі.

"Спробы заўсёды інспіраваліся спецслужбамі, даводзіліся да кіпення. Не выключэнне і гэты выпадак. Двух хлопцаў, якія з'яўляюцца ключавымі фігурамі ў маладзёжным нацыянальным руху, доўга спрабавалі пасварыць паміж сабой. Пэўны час гэта ўдавалася стрымліваць. Але ў пэўны час хлопцы праявілі слабасць і пайшлі на гэты канфлікт".

П.Севярынец кажа, што правакацыі цягнуліся апошнія некалькі месяцаў. На жаль, кажа ён, не ўдалося памірыць і стрымаць канфлікт паміж Зміцерам Дашкевічам і Артурам Фінькевічам. Вінаватымі ў канфлікце ён лічыць абодвух лідэраў, якія не змаглі пайсці насустрач адзін аднаму.

"Яны, на мой погляд, павялі сябе няправільна. Адзінства "Маладога фронту" — гэта галоўнае. Амбіцыі, пасады — гэта другаснае. Палітыка не ў тым, каб віртуозна абвінавачваць адзін аднаго альбо выключаць адзін аднаго аднекуль. Палітыка — у тым, каб дамаўляцца".

На думку Севярынца, канфлікт не зацягнецца даўжэй, чым на пару тыдняў. Пасля гэтага арганізацыя зноў стане адзінай. Але палітык не выключае, што поруч з "Маладым фронтам" з'явіцца яшчэ адна маладзёжная арганізацыя.

ЖАХ!

«Памрэш, а ніхто і не заўважыць...»

Мінчанка Галіна Апанасевіч, як і ўсе беларусы, якія маюць права голасу, атрымала запрашэнне прыйсці на выбары. Але на выбары яна не пайшла — не дазволіла здароўе, у пажылой жанчыны пачаліся праблемы з сэрцам. А ўсё з-за таго, што, акрамя Галіны Васільеўны, запрашэнне наведаць выбарчы ўчастак атрымаў яе муж, якога яна пахавала напрыканцы студзеня гэтага года...

"Я, калі адкрыла паштовую скрыню, дык не змагла стрымаць слёз, — расказвае Галіна Васільеўна. — *Ледзьве расчытала на гэтым запрашэнні ўласнае прозвішча з ініцыяламі. Але, калі ўбачыла, што побач з маім напісана і прозвішча майго мужа, то заплакала..."*



ПАВЕДАМЛЕННЕ

Паважаны [illegible]
(ініцыялы, прозвішча выбаршчыка)

28 верасня 2008 года адбудуцца выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Запрашаем Вас прыняць удзел у галасаванні **з 8 да 20 гадзін** ва ўчастку для галасавання № [illegible], размешчаным па адрасу: [illegible]

Калі Вы не будзеце мець магчымасці прыйсці на ўчастак для галасавання ў дзень выбараў, паведамляем, што ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь Вы маеце права прагаласаваць датэрмінова **з 23 верасня па 27 верасня бягучага года ўключна з 10 да 14 гадзін і з 16 да 19 гадзін** у памяшканні ўчастковай выбарчай камісіі.

Пры галасаванні Вы павінны мець пашпарт або пасведчанне асобы, якое замяняе яго.

1 РУП «БДД». З. 2420. 2008 г.

Участковая выбарчая камісія

Вось так. Усе сведчанні афіцыйнай улады аб тым, што ў Беларусі лічаць кожны голас і ведаюць ледзьве не кожнага выбаршчыка, лопнулі як мыльны пухір. І добра яшчэ, што ў Галіны Васільеўны вытрымала сэрца, хаця тры дні жанчыне прыйшлося прымаць таблеткі...

Хто стаў аўтарам такога дзікунства? Па ідэі "выбарчыя" запрашэнні выпісваюцца сябрамі ўчастковых выбарчых камісій. Не ведаю, ці здаюць сябры выбарчых камісій іспыт на "каліграфічнасць" почырку, але таму, як было выпісана запрашэнне Галіне Апанасевіч, мог бы пазайздросціць любы медык... Прачытаць, а тым больш зразумець, што напісана ў запрашэнні, проста немагчыма.

"Гэта ж здзек з чалавека", — абураецца Галіна Васільеўна. — Мала таго, што запрасілі на выбарчы ўчастак майго мужа-нябожчыка, дык яшчэ напісалі адрас выбарчага ўчастка так, што зразумець што-небудзь проста немагчыма..."

На выбары жанчына не пайшла: *"Пасля таго, што адбылося са мной напярэдадні выбараў, я зразумела, што просты чалавек у Беларусі — ніхто. Пыл, смецце... Памрэш, а ніхто і не заўважыць. І пакуль буду жывая, на выбары я не пайду ніколі..."*

Віталь ГАРБУЗАЎ.



ПАСВЕДЧАННЕ АБ СМЕРЦІ

Грамадзянін(ка) АПАНАСЕВІЧ
прозвішча,
МІХАІЛ АНДРЭЕВІЧ
уласнае імя, імя па бацьку
памёр(ла) 23.01.2008
число, месяц, год лічбамі і літарамі
ДВАЦЦАЦЬ ТРЭЦЯГА СТУДЗЕНЯ
ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ВОСЬМАГА ГОДА
ва ўзросце 74 гадоў, аб чым у кнізе рэгістрацыі актаў аб смерці
26 чысла СТУДЗЕНЯ месяца 2008 года
зроблен запіс за № 1373.
Прычына смерці ЭНЦЕФАЛОПАТИЯ
Месца смерці: рэспубліка (дзяржава) БЕЛАРУСЬ
вобласць (край)
раён
горад (пасёлак, сяло, вёска) МІНСК.

ПРОТЕСТ

При закрытых глазах

Член Центральной избирательной комиссии в знак протеста покинула итоговое заседание

3 октября Центральная избирательная комиссия подвела итоги выборов. На заседании ЦИК присутствовали и представители оппозиционных партий — члены ЦИК с правом совещательного голоса. Член Партии БНФ Галина Семдянова в знак протеста покинула заседание.

— Руководство ЦИК представило на заседание комиссии только замечания наблюдателей, которые присутствовали на участках. Погоды эти документы не делали и в любом случае не могли повлиять на конечный результат голосования, — о подробностях того заседания рассказал член ОГП Владимир Романовский. — Что касается жалоб кандидатов, то было объявлено, что их ЦИК рассмотрит после 14 октября. Т.е. тогда, когда полномочия членов ЦИК с правом совещательного голоса будут закончены. Это означало, что нас допустили на рассмотрение несерьезных вопросов.

Именно по этой причине в знак протеста Галина Семдянова и покинула заседание ЦИК.

Любопытными мне показались только цифры голосования, которые были озвучены на итоговом заседании комиссии. По данным ЦИК, средний процент голосов за представителей всех ветвей власти — а таких кандидатов было 30 человек — составил 76 процентов. За бывших депутатов, которые попали и в новый состав парламента, в среднем проголосовало 65 процентов избирателей. Хотя еще в июле НИСЭПИ, зарегистрированный в Литве, проводил опрос по поводу доверия власти, и его результаты существенно отличались от результатов нынешнего голосования. Тогда только 35 процентов респондентов заявили о своем доверии власти, и 34 процента — о доверии белорусским депутатам. Согласитесь, сложно поверить в то, что белорусский избиратель так круто поменял свое мнение за каких-то два месяца.

В своем выступлении я остановился на том, что фактически в Беларуси был блокирован контроль за проведением выборов со стороны общественности и наблюдателей. На мой взгляд, это незаконная трактовка и Конституции, и избирательного законодательства, потому что нигде не прописано, что нельзя, например, предоставлять наблюдателям избирательные документы.

— Как долго заседала Центральная избирательная комиссия?

— Около трех часов. Но это не значит, что разговор шел конструктивный. Более 80 процентов времени мы слушали отчеты кураторов, которые говорили о том, как замечательно прошли выборы на всех участках, а заявления о нарушениях, которые поступили в ЦИК, необоснованны.

— На ваш взгляд, был ли смысл оппозиции соглашаться на вариант, когда в ЦИК были делегированы представители партий только с правом совещательного голоса? Ведь по сути вы не могли влиять ни на одно решение ЦИК...

— Конечно, смысл был. Мы смогли донести свои позиции до общественности. Во-вторых, наше присутствие в некой степени дисциплинировало работу ЦИК, штатным членам Центризбиркома пришлось несладко. На заседании комиссии 18 сентября им, например, все-таки пришлось рассматривать поставленный нами вопрос о законности создания окружных и участковых комиссий. Тогда же мы поставили вопрос о допуске наблюдателей к подсчету голосов. Центризбирком принял положительное решение только в части окружных комиссий. При этом Ермошина заявила, что такое решение ЦИК принимает только из уважения к нам. Представляете, какое лицемерие! Но в любом случае этот вопрос мы поставили и в конечном итоге это повлияло на заключительные выводы даже г-жи Ермошиной. Теперь она не говорила о том, что выборы прошли без сучка и задоринки, а заявила, что нам надо корректировать избирательный процесс.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ВЕРСІІ

Чым «нулявы варыянт» пагражае Лукашэнку?

Афіцыйныя вынікі выбараў у Палату прадстаўнікоў перакрэслілі ўсе прагнозы тых, хто казаў, што ў новым складзе гэтай установы будзе некалькі апазіцыянераў. Пра якую апазіцыю можна казаць, калі ў Палаце не знайшлося месца нават цяперашняй парламенцкай фрондзе — Вользе Абрамавай і Віктару Кучынскаму?! Яны балатаваліся на апошніх выбарах, але, калі верыць афіцыйнаму падліку галасоў, саступілі сваім супернікам. І Абрамава, і Кучынскі час ад часу дазвалялі сабе крытыкаваць дзеянні ўлад, задавалі высокім прадстаўнікам выканаўчай улады нязручныя пытанні. Ніякай рэвалюцыі, зразумела, яны не зрабілі ды і ў такім атачэнні не маглі зрабіць. Як не маглі б зрабіць гэтага Ляўковіч, Раманчук, Нісцюк ці яшчэ нехта іншы, чые прозвішчы ўзгадваліся ў якасці верагодных дэпутатаў.

Дык чаму ж тады Аляксандр Лукашэнка не захацеў прапусціць у Палату №4 хаця б пару-тройку апазіцыянераў? Навуковец Вацлаў Арэшка ў размове са мною выказаў, на мой погляд, цікавую версію. Ён кажа, што вытокі такога рашэння ляжаць у галіне псіхалогіі.

"Шчыра кажучы, апошнім часам у мяне ўжо складалася ўражанне, што найхутчэй Лукашэнку не спатрэбяцца ў парламенце, так бы мовіць, людзі збоку. Улады вырашылі, што і так усё пройдзе. Ёсць некаторыя касметычныя змены, ёсць імітацыя сапраўдных выбараў. Таму няма абсалютна ніякага сэнсу прапускаць нейкіх падазроных людзей у парламент. Таму што для Лукашэнкі гэта адчуванне паразы.

Я думаю, з аднаго боку, тут была чарговая спроба падмануць Еўропу. З другога боку, мяркую, тут ёсць псіхалагічны падыход — ён не можа бачыць сапернікаў, не можа бачыць, што ён быццам нешта здае".

Ёсць і яшчэ адна версія таго, што адбылося. Некаторыя замежныя дыпламаты, якія пастаянна працуюць у Мінску і якія прыязджалі сюды на выбары ў якасці назіральнікаў і гасцей, гавораць пра расійскую карту. Маўляў, гэта агенты Крамля, якіх, як яны сцвярджаюць, у Беларусі процьма, падштурхнулі кіраўніка краіны да такога рашэння. Яны, быццам, раілі праявіць характар, паказаць, што ніякай апазіцыі ў Беларусі няма. Можа, і сапраўды пад іх уплывам Лукашэнка ў дзень выбараў публічна паабяцаў, што апазіцыя ў Беларусі знікне праз некалькі месяцаў ці некалькі гадоў?

Але тады ўзнікае пытанне: а навошта Расіі гэта патрэбна? На яго існуе стратэгічны адказ: Маскве патрэбна, каб у Еўропе была яшчэ хоць адна краіна, у якой справы з правамі чалавека і дэмакратыяй былі б горшымі, чым у самой Расіі. Тады асабліва настойлівым крытыкам Расіі можна параіць разабрацца спачатку з невялікай Беларуссю, а ўжо потым звяртацца да расійскіх спраў.

Але цяперашні час робіць гэта пытанне асабліва актуальным. І звязана яно найперш з прызнаннем Расіяй Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Гэта рашэнне Масквы пакуль падтрымала толькі адна краіна ў свеце — Нікарагуа.

Беларусь дагэтуль такога рашэння не прыняла. Хаця да Аляксандра Лукашэнкі звярталіся асабіста кіраўнікі гэтых дзвюх каўказскіх рэспублік. На іх заклікі беларускі прэзідэнт адказаў, што спачатку нам трэба правесці парламенцкія выбары. А ўжо потым новы склад Нацыянальнага сходу разгледзіць гэта пытанне. Зразумела, што ў Маскве, дзе цудоўна ведаюць, што беларускі парламент самастойна, без "указіўкі" з прэзідэнцкай адміністрацыі, ніколі не прымае больш-менш важных рашэнняў, такі адказ палічылі як здзек. І таму з вуснаў розных расійскіх палітыкаў прагучала незадаволенасць пазіцыяй бліжэйшага саюзніка.

І сапраўды, такая незгаворлівасць афіцыйнага Мінска ставіць Маскву ў складанае становішча. Мае суразмоўцы-дыпламаты гавораць, што Расія цяпер усялякімі праўдамі і няпраўдамі, пагрозамі і абяцаннямі спрабуе дамагчыся прызнання Паўднёвай Асеціі і Абхазіі хаця б некаторымі еўрапейскімі краінамі. Маўляў, чаму прызналі Косава, а не прызнаюць Паўднёвай Абхазіі і Асеціі? У еўрапейцаў на такое пытанне існуе просты адказ: гэтыя краіны не прызнае нават ваш бліжэйшы саюзнік — Беларусь, а вы патрабуеце гэтага ад нас. Разбярыцеся спачатку з Мінскам, а потым ужо звяртайцеся да нас.

І, падобна, што час разборак надыходзіць. Аналітыкі звярнулі ўвагу на тое, што расійскі прэм'ер Уладзімір Пуцін, які днямі прыязджаў у Мінск на пасяджэнне саюзнага ўрада, папрасіў асабістай сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. Можна меркаваць, што спадар Пуцін казаў пра тое, як цяжка цяпер будзе Маскве апраўдваць вынікі парламенцкіх выбараў у Беларусі на міжнароднай арэне, як Мінск сваімі няўклюднымі дзеяннямі дадае Маскве складанасцяў. Можна меркаваць, што кіраўнік расійскага ўрада казаў і пра тое, што на фоне ўсясветнага фінансавага крызісу Маскве стане намнога цяжэй знайсці грошы для крэдыту Беларусі. І, як мы ўжо ведаем, невыпадкова ўзнікла пытанне, якое Уладзімір Пуцін публічна задаваў нядаўна ў Сочы: а чаму гэта Беларусь разлічваецца з намі за газ долярамі, а не расійскім рублём?

Праўда, гэтыя пытанні можна і зняць. Але тады Мінск мусіць неадкладна прызнаць Паўднёвую Асецію і Абхазію. А там, глядзіш, і Нагорны Карабах. Бо прэзідэнт Арменіі днямі на Генеральнай сесіі ААН у Нью-Йорку публічна заявіў, што яго краіна звернецца да іншых краін, найперш, Расіі з просьбай аб афіцыйным прызнанні Нагорнага Карабаха як самастойнай дзяржавы.

Вось якія складаныя наступствы можа пацягнуць за сабою на першы погляд такі просты "нулявы варыянт". Застаецца толькі задаць традыцыйнае для газет савецкага часу пытанне: а куды глядзеў?.. І сапраўды: а куды ж глядзелі кіраўнік прэзідэнцкай Адміністрацыі — прафесійны дыпламат Уладзімір Макей, міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў, старшыня камісіі па міжнародных справах Савета Рэспублікі Мікалай Чаргінец ды іншыя асобы, якія на сваіх пасадах павінны думаць пра тое, як "нулявы варыянт" беларускіх выбараў адаб'ецца на сувязях Беларусі са знешнім светам.

Уладзімір ГЛОД.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Хто самы папулярны апазіцыянер па версіі ЦВК?

Я ўпэўнены, што выбары, якія адбыліся, не былі ні чэснымі, ні справядлівымі. Але ўсё ж цікава: якія лічбы лідэрам апазіцыі "намалявалі" выбарчыя камісіі?

В.В.Лаўруцікаў, г.Магілёў.

Амаль усе лідэры апазіцыі, як вядома, балатаваліся ў парламент у Мінску. Згодна з афіцыйна надрукаванай інфармацыяй, са спісу кандыдатаў ад АДС найлепшыя лічбы атрымала кандыдат ад Партыі БНФ Валянціна Свяцкая. З агульнай колькасці 37.068 выбаршчыкаў, што (нібыта) прынялі ўдзел у галасаванні па Ясенінскай выбарчай акрузе №100, Свяцкай аддадзена 7500 галасоў, што складае 20,23%.

Для параўнання скажам, што Сяргею Калякіну "далі" 15,65% галасоў, Ігару Рынкевічу — 15,41%, Алесю Міхалевічу — 14,01%, Аляксандру Бухвоставу — 13,49%, Людміле Гразновай — 10,59%, Анатолю Лябедзьку — 9,67%, Станіславу Шушкевічу — 1,85%. З інфармацыі, абнародаванай ЦВК, вынікае, што самым папулярным дэмакратам краіны з'яўляецца член АГП Аляксандр Валчанін з Жодзіна. Ён набраў амаль 24% галасоў.

ПРОРОЧЕСТВО

Владимир ПАРФЕНОВИЧ, трехкратный олимпийский чемпион, экс-депутат Палаты представителей:



— До тех пор, пока в Беларуси будут непрозрачные выборы, пока сохранится досрочное голосование, пока комиссии будут формироваться так, как они формируются сейчас, наш Кастро будет с нами всегда..."

("БГ", 10.04.2006 г.)

Паслявыбарны эксперымент

На прадпрыемстве "Полацк-Шкловалакно" актывісты незалежнага прафсаюза правялі тайнае дубль-галасаванне, каб праверыць афіцыйныя вынікі выбараў.

Умова была адна: прагаласаваць так, як на выбарах, не галасаваць тым, хто ў выбарах не ўдзельнічаў. Вынік эксперыменту такі. Узялі ўдзел у галасаванні 57% тых, хто меў права голасу. За спадара Южыка, намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама, — 29%, за сацыял-дэмакрата Альберта Маркава — 14%, супраць усіх — 14%.

Між тым паводле афіцыйных даных былы чыноўнік аблвыканкама перамог, атрымаўшы амаль 61% галасоў. "Аўтары" эксперыменту ўпэўнены: такога быць проста не магло. Па іх акрузе не перамог ні адзін з кандыдатаў, і павінны былі праводзіцца паўторныя выбары.

Аляксандр Мех патрабуе прызнаць вынікі выбараў несапраўднымі

З адпаведнай заявай кандыдат у дэпутаты па Кобрынскай выбарчай акрузе №12 звярнуўся ў Цэнтральную выбарчую камісію.

Пералік парушэнняў, якія былі зафіксаваны даверанымі асобамі кандыдата ад Партыі БНФ Аляксандра Меха падчас парламенцкіх выбараў у Кобрыне, занялі ў заяве некалькі старонак. Парушэнні, лічыць Аляксандр Мех, мелі месца і падчас датэрміновага галасавання, і пры выяўленні несапраўдных бюлетэняў, акрамя таго ні на адным участку незалежных назіральнікаў і прадстаўнікоў кандыдата ад Партыі БНФ не дапусцілі да падліку галасоў. Усе свае высновы спадар Мех падмацаваў канкрэтнымі фактамі. Ён патрабуе ад Цэнтральнай выбарчай камісіі наступнае:

1.Прызнаць вынікі выбараў на ўчастках №1,5,11,38 і №4 Кобрынскай выбарчай акругі №12 несапраўднымі.

2.На ўчастку №8 Кобрынскай выбарчай акругі №12 правесці ў прысутнасці даверaных асоб кандыдата праверку несапраўдных бюлетэняў на прадмет магчымага нанясення наўмыснай шкоды.

3.На астатніх участках у прысутнасці даверaных асоб кандыдата ў дэпутаты правесці праверку і пералік галасоў.

Наколькі магчыма спадару Меху атрымаць станоўчы адказ з Цэнтрвыбаркама ў сітуацыі, калі парламенцкія выбары ў Беларусі ўжо абвешчаны адбыўшымися і нават надрукаваны склад дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў 4-га склікання? Дарэчы, у Беларусі няма прэцэдэнтаў, калі б ЦВК задаволіла скаргу апазіцыйнага кандыдата і, напрыклад, у якой-небудзь акрузе прайшлі паўторныя выбары менавіта па гэтай прычыне.

— Заяву кандыдатаў у дэпутаты мы перасылаем у акруговыя камісіі, — патлумачыў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. — Яны ў сваю чаргу прымаюць рашэнне і інфармуюць Цэнтрвыбаркам і асабіста кандыдата ў дэпутаты.

Трэба адзначыць, што Аляксандр Мех не адзіны кандыдат у дэпутаты, які патрабуе прызнання парламенцкіх выбараў несапраўднымі. З такімі ж заявамі ў Цэнтрвыбаркам звярнуліся Вольга Казуліна, Сяргей Калякін, Юрась Губарэвіч, Анатоль Лябедзька і шэраг іншых кандыдатаў у дэпутаты.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Мінімум галасоў ад выбаршчыкаў атрымалі дзеючыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў (па версіі ЦВК):

— Ларыса Кузняцова (Гомельская Савецкая акруга) — 50,1%;

— Ларыса Вершаловіч (Лунінецкая акруга — 50,4%).

Нечакана высветлілася, што рэйтынг шараговага чыноўніка Віцебскага аблвыканкама вышэйшы за рэйтынг губернатара. Так, максімальную па краіне падтрымку, згодна з афіцыйнай інфармацыяй, выбаршчыкі аказалі Васілю Бакову, старшыні Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў, які балатаваўся па Віцебскай сельскай акрузе, — 87,8% галасоў. А вось Уладзіміру Андрэйчанку — старшыні Віцебскага аблвыканкама, які стаў дэпутатам ад Глыбоцкай акругі, давер аказалі 85,9% выбаршчыкаў.

У ТЭМУ

Цэнтрвыбаркам Беларусі прызнае, што існуюць факты недакладнасці спісаў выбаршчыкаў. Але, на думку сакратара ЦВК Мікалая Лазавіка, яны не могуць уплываць на вынікі выбараў.

Чыноўнікі ЦВК лічаць, што недакладнасць выбарчых спісаў — праблема сусветнага маштабу. Там, дзе спісы складаюцца на падставе звестак жыллёвай рэгістрацыі, заўсёды ёсць праблемы са спісамі, — заявіла кіраўніца Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.

М.Лазавік заявіў, што спісы складаліся ў сярэдзіне жніўня, за гэты час выбаршчыкі маглі ажаніцца, пераехаць, памерці. Але ён не даў ніякіх тлумачэнняў, чаму ў спісах не аказалася людзей, якія не паміралі, не з'язджалі і не жаніліся, як у іх аказаліся зніклыя Віктар Ганчар і Юрый Захаранка, а таксама тыя, хто памёр ужо некалькі гадоў таму.

ПОСТФАКТУМ

Анатолий Лебедько, кандидат в депутаты по Старовиленскому избирательному округу №105

Старовиленский полигон

У Старовиленского избирательного округа №105 есть своя "кредитная история". Избиратели, проживающие на территории Центрального района Минска, в большинстве своем ориентированы на позитивные перемены и на демократического кандидата. В 1990 году здесь голосовали за представителей БНФ. В 1995-м здесь избрали депутатом парламента одного из лидеров Объединенной гражданской партии Павла Данейко. Четыре года назад по данным экзит-пула большинство избирателей поддержало Владимира Колоса. Менялись территория округа и количество избирателей, но неизменными оставались настроения и предпочтения людей, которые здесь живут.

Нынче за поддержку 65 тысяч избирателей должны были бороться четыре претендента. Впрочем, статистика здесь ни к чему. Кандидаты от власти праздновали успех уже в первом туре и по всей стране, независимо от количества оппонентов, их популярности и прочих факторов, без которых невозможно получить необходимый результат. Феноменальное достижение, достойное занесения в Книгу рекордов Гиннесса. Лукашенко в приказном порядке женил избирателя на списке своих кандидатов в депутаты.

Зададимся вопросом: может ли кандидат в депутаты набрать уже в первом туре более 50% голосов? Да, это возможно, но для этого должны существовать особые условия. Надо либо иметь высокую узнаваемость и известность, либо идеально попасть в ожидания избирателей. У меня есть опыт прохождения в парламент с первой попытки. В 1990 году на выборах в Верховный Совет 12-го созыва я набрал уже в первом туре 74% голосов среди четырех кандидатов. Мне откровенно повезло. Страна переживала электоральную революцию. Я органично вписался в ожидания и протестное голосование ошмянского избирателя. Через пять лет у меня была другая ситуация, но тот же результат. В первом же туре, при наличии 10 претендентов, за меня проголосовал 61% избирателей. Почему? К этому времени у меня была едва ли не стопроцентная узнаваемость и громадный объем проделанной в округе работы. Для примера, на каждый прием к депутату Лебедько приходило до ста человек. Что еще? В обоих случаях я не являлся кандидатом от власти. Но определяющим фактором было то, что и в 1990-м и в 1995 годах в избирательных комиссиях считали голоса и там были мои представители и сторонники.

Накладывая отмеченные выше параметры на избирательную кампанию 2008 года, надо признать, что кандидат от власти по Старовиленскому округу никак не вписывался в показатели "50% плюс один голос". Принимая во внимание характер подсчета голосов, позволю себе некоторые персональные оценки. Избиратель массово не станет голосовать за малоизвестного кандидата, у которого к тому же стандартная, едва заметная избирательная кампания. Листовка с набором лозунгов, набивших оскомину, да цветной портрет — этого явно недостаточно, чтобы в наше время зацепить людей. Не было ничего оригинального, креативного и в действиях команды председателя суда Центрального района. Он даже не позиционировал себя как гранатометчик, готовый защищать президента до последнего патрона.

Иногда какое-то количество людей голосует за профессию претендента. Здесь неплохо идут врачи, социальные работники, педагоги, но никак не судьи. Отношение к представителям судебной системы в целом негативное. Суд для многих ассоциируется с коррупцией и зависимостью от исполнительной власти. Мой недавний оппонент, наверное, человек неплохой. Хотя у активистов партий, которых судил либо сам председатель суда Центрального района, либо подчиненные ему судьи, может быть свое мнение на этот счет.

В этой ситуации, чтобы кандидат от власти получил депутатский мандат уже в первом туре, должно было случиться разве что чудо. И его сотворили.

Как же клепался нужный результат? За счет чего делались нужные цифры? Предлагаю мои предположения с элементами утверждения.

Предварительное голосование. Если в Европе это дополнительное удобство для избирателей, то в Беларуси это едва ли не 100%-ный ресурс кандидата от власти и регулятор явки избирателей. Я приношу заранее извинения тем, кто выполнял свой гражданский долг по доброй воле. Но много было и тех, кто стал жертвой крепостной зависимости от администрации вуза, общежития. На участках № 449, 456, 466, 467, 475 Старовиленского округа явка избирателей явно выбивается из общего ряда. Если на большинстве участков она плавала в районе плюс-минус 50, то здесь, по данным наших избирателей, количество проголосовавших колебалось от 64,9 до 88,3%. Что их объединяет? Здесь голосовали студенты БГУ, университета физкультуры и работники ряда предприятий, проживающие в общежитии. Людей, не имеющих своего жилья, равно как и молодежь, никак нельзя отнести к группе поддержки нынешней власти. В их среде концентрация протестных настроений на порядок выше, чем в целом по стране. Поэтому логично, если на досрочном голосовании и явка избирателей в общежитиях была невысокой и результаты голосования были явно не в пользу кандидата от власти. Но вот парадокс: эти люди не только массово принимали участие в голосовании до 28 сентября, но и поголовно голосовали за представителя власти. Это по официальной версии. А в реальности на том же участке №456, что располагался в школе №44, после обеденного перерыва международные и белорусские наблюдатели зафиксировали вскрытие урны с бюллетенями для досрочного голосования. Мера, как оказалось, вынужденная. Запустить руку в урну в дневное время пришлось по причине того, что настойчивые наблюдатели заставляли на ночь обвязывать веревкой ящик со всех сторон.

Выносная урна. Еще одна скатерть-самобранка для обильных манипуляций. Законодательство предусматривает посещение избирателя на дому в случае, если он не в состоянии лично прибыть на избирательный участок. Для этого необходимо, чтобы была заявка. Желательно письменная. На практике все обстоит гораздо проще. В список поголовно вносятся все люди преклонного возраста. А дальше прослеживается странная закономерность. Когда вместе с членами комиссии присутствовал мой наблюдатель, то желающих проголосовать на дому было немного, человек 13—15. Но у тех, кто выходил с урной в народ параллельно, но без присутствия наблюдателей, "улов" неизменно оказывался в 10—12 раз больше. Разительно отличались и результаты голосования. В присутствии Сергея Альфера, Вадима Казначеева и других наблюдателей от Объединенной гражданской партии кандидат от власти выше третьего места не поднимался. Но вы не поверите: там, где работали члены избирательной комиссии, "не отягощенные" присутствием представителей ОГП, почти все 100% голосующих неизменно выбирали представителя власти.

Но самый креативный источник сбора голосов за представителя власти это **"мертвые души"**. Я утверждаю, что в Старовиленском округе были осуществлены массовые приписки избирателей, якобы принявших участие в голосовании. На тех участках, где наблюдение осуществлялось на протяжении всех шести дней, я утверждаю с точностью до одного избирателя. Методика выявления "мертвых душ" предельна проста. Суммируются избиратели, проголосовавшие досрочно, и те, кто голосовал 28 сентября, и мы получаем количество избирателей, принявших участие в голосовании. И вот здесь обнаруживаются существенные расхождения с цифрами, зафиксированными в итоговых протоколах участковых комиссий. Несколько примеров. Участок №484, что по улице Гая в школе №95. На протяжении шести дней наблюдатели зафиксировали 658 человек, принявших участие в голосовании. Считали каждого опустившего бюллетень в урну. Добавим 20 избирателей, якобы проголосовавших через выносную урну. Итого 678. Но в протоколе участковой комиссии значится 1152 проголосовавших. Получается голосование по Гоголю. Приписка составила 494 "мертвые души". На участке №453, разместившемся по ул.Л.Украинки, 2 в гимназии №16, таковых набралось 405. На соседнем участке №454 — еще 470 "мертвых душ". И так далее, практически на каждом участке, где велся подсчет проголосовавших избирателей, — расхождения измеряются сотнями избирателей.

Это откровенное шулерство, именуемое "элегантной победой". Можно ли это доказать сегодня? Безусловно. Именно по этой причине я и обжаловал результаты "голосования" по Старовиленскому избирательному округу №102. На заседание окружной избирательной комиссии 3 октября я пришел с честным предложением для честных членов комиссии. Вначале пришлось задать риторический вопрос: "В состоянии ли два человека с высшим образованием в течение дня сосчитать до тысячи"? Это не стал оспаривать никто. И тогда я предложил окружной комиссии создать рабочую группу в составе представителей из окружной и участковой комиссий, а также от заинтересованных кандидатов в депутаты и провести по одному из участков сверку избирателей, принявших участие в голосовании. Это не требует каких-то дополнительных затрат. Надо просто вооружиться списками избирателей с росписями проголосовавших и обойти порядка двух тысяч людей. И мы получим ясный ответ на вопрос, что же на самом деле имело место в Старовиленском избирательном округе №105 выборы или фальсификация итогов волеизъявления десятков тысяч людей.

Увы, тест на беспристрастность и порядочность окружная избирательная комиссия не прошла. Мое предложение вызвало настоящий переполох как среди членов окружной комиссии, так и у присутствовавших на заседании председателей участковых избирательных комиссий. Его даже не поставили на голосование. Я физически ощущал страх, исходивший от двух с половиной десятков людей, мужчин и женщин, молодых и убеленных сединой. На какое-то мгновенье мне даже стало их жалко. И в то же время было противно.

Я получил то, что хотел. Доказательство того, что избирателей обманули и депутата назначили. Опровергать этот очевидный факт окружная комиссия не стала.

P.S. *Нынешняя избирательная система дискредитировала себя дальше некуда. И здесь у меня два предложения на вопрос "Что делать?". Я предлагаю назначенным депутатам в знак благодарности законодательно наделить Лукашенко правом назначать депутатов всех уровней. То есть юридически закрепить то, что уже 12 лет происходит на практике. По крайней мере, никто не будет дурачить людей, да и экономия для бюджета приличная. А вот Объединенным демократическим силам я предлагаю начать сбор подписей за изменение избирательного законодательства и проведение новых выборов в Палату представителей. И это надо делать теперь, а не завтра, когда наступит время новой избирательной кампании.*

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ЭКСПЕРТИЗА

«Белорусы должны знать, как проходят выборы в нашей стране»

Координатор кампании "За справедливые и свободные выборы" ***Виктор Корнеенко*** *подводит итоги*



Нельзя сказать, что прошедшая политическая кампания отличалась сложностью своей драматургии. Как и ожидалось, выборы были назначены на осень, и, как всегда, это случилось неожиданно для многих политиков страны. Споры о формате участия оппозиции в выборах, порой принимавшие самые непристойные формы, продолжались всю кампанию и не стихают после ее окончания. Если не принимать во внимание некоторые оттенки, все предложенные варианты свелись к трем формулам: "Полный бойкот!", "Агитируем и снимаемся!", "Идем до конца!". Интриги прибавило и международное сообщество, оперативно и с надеждой отреагировавшее на выполнение одного из требований оппонентов белорусского режима — освобождение политзаключенных.

С моей точки зрения, все три предложенных варианта при определенных обстоятельствах и политической конъюнктуре имеют право на жизнь, однако ни один из них не отвечал в полной мере на вопрос "А что является критерием успеха?". За что боремся, вроде понятно, но что нас ждет в конце борьбы, что будет объявлено победой, и насколько эта победа приблизит нас к реальной демократии? Полагаю, именно с этого ракурса наиболее правильно и справедливо оценивать позиции, а сегодня — уже и проделанную работу приверженцев всех рассматриваемых точек зрения.

Свое отношение к предстоящей политической кампании лидеры и активисты создаваемого движения "За свободу!" определяли, исходя из белорусских реалий. С одной стороны, прогнозировалась невысокая активность избирателей. Так, по данным Балтийской службы Гэллапа, в мае 2008 года половина граждан Беларуси считала парламент чем-то вроде пятого колеса в телеге, полагая, что стране достаточно одного президента. Людям, мыслящим трезво, было понятно, что пользы из этой кампании много не получится.

В то же время глупо не использовать предоставляющиеся при выборах возможности легальной и относительно безопасной работы для продвижения своих политических идей. На этом важном этапе нам также предстояло определиться: а кто мы есть на самом деле — новая политическая партия со своей идеологией, корпоративными интересами или нечто, от партии отличающееся? Кратковременная дискуссия на этот счет сформулировала мнение большинства — движение "За свободу!" не является политической партией, а посему не будет выдвигать своих кандидатов в депутаты, а свою работу во время выборов будет проводить в соответствии с декларируемыми в уставе целями и задачами. Поскольку одна из целей движения — добиться проведения в Беларуси свободных и справедливых выборов, логично и целесообразно стало наше участие именно на этом направлении. Разработанный нами план кампании "За справедливые выборы" мы предложили к реализации в рамках коалиции Объединенных демократических сил. Президиум с предложением согласился.

Прошло шесть месяцев кампании. Что было сделано и каковы итоги проделанной работы?

Вначале — о целях. После президентских выборов 2006 года, которые многим запомнились массовыми акциями протеста по причине массовых фальсификаций и подтасовок, нас поразили некоторые социологические данные. Например, по исследованиям лаборатории НОВАК, несмотря на принудительное досрочное голосование, массовые аресты оппозиционеров, непризнание выборов всеми авторитетными международными институтами и демократическими странами, около 70% белорусских избирателей оценивают избирательный процесс как "относительно демократичный". Аналогичные исследования НИСЭПИ давали несколько иной результат, но и они никак не соответствовали представлениям оппозиционных политиков. Полагаю, что такие ошеломляющие результаты объяснять только пропагандой государственных СМИ было бы неправильно. Во всех последних электоральных кампаниях оппозиция пыталась в первую очередь убедить в недемократичности белорусских выборов именно международное сообщество, а не своих избирателей. К ОБСЕ, Совету Европы, Евросоюзу апеллировали в случаях вопиющих нарушений. ОБСЕ, Совет Европы, Евросоюз в свою очередь наряду с белорусскими правозащитниками оставались единственными оценщиками результатов выборов.

Нисколько не умаляя авторитета международных инстанций и значимости принимаемых ими решений, полагаю, что такой однобокий подход ошибочен. Рассчитывать на массовую поддержку оппозиции гражданами страны и ожидать от них активной защиты результатов выборов можно только в том случае, если избиратели уверены в своей правоте. Кампания "За справедливые выборы" и была направлена именно на то, чтобы помочь избирателям разобраться во всем происходящем вокруг выборов.

Для того чтобы добиться реальной демократизации избирательного процесса, Президиум ОДС разработал пакет требований к властям, при условии выполнения которых выборы можно было признать относительно демократичными. Их основная суть сводилась к четырем предложениям:

— гарантировать включение хотя бы по одному представителю от оппозиции во все избирательные комиссии;

— обеспечить реальную возможность для всех кандидатов вести агитационную кампанию;

— проводить подсчет голосов избирателей в строгом соответствии с Избирательным кодексом;

— обеспечить наблюдателям реальную возможность видеть процедуру подсчета голосов.

Конечно, мы не очень-то надеялись, что эти предложения будут приняты, не для того создавалась машина фальсификаций, чтобы вот так, запросто, от нее отказаться. Но в таком случае мы получали убедительные доказательства абсурдности властных решений. Ведь отказав нам по всем пунктам, она, по сути, публично признала, что:

1. Оппозиции нет места в избирательных комиссиях;

2. Агитацию кандидаты должны проводить под присмотром властей;

3. Считать голоса избирателей надо не так, как записано в Избирательном кодексе;

4. Наблюдатели не должны видеть процесс подсчета голосов.

Конечно, можно было без постановлений ЦИК, что называется, на деле доказать, что это не так. Мы предоставили властям такой шанс и выдвинули своих представителей во все окружные избирательные комиссии и около полутора тысяч человек — в участковые. Мы стремились выдвинуть в состав комиссий людей опытных, чей авторитет признан как у нас в стране, так и за ее пределами. Среди наших кандидатов были бывшие парламентарии, министры, мэры городов, член Конституционного суда и даже бывший глава государства! Отказ органов власти включить этих заслуженных людей рядовыми членами в избирательные комиссии, я уверен, разоблачает "демократичность" и "прозрачность" белорусских выборов как ничто другое. В результате проделанной ОДС работы мы получили убедительные доказательства того, что власть упорно не желает менять сложившуюся практику проведения выборов, несмотря на нелицеприятные оценки международных институтов и демократических стран.

Следующая, не менее важная задача кампании — донести полученные данные до избирателей страны. Кое-что в этом направлении уже сделано, но этого явно недостаточно. Используя независимые СМИ, информационные листки, другие доступные способы, мы будем продолжать эту работу. Белорусы должны знать, как проходят выборы в нашей стране!

Оценить проделанную работу сложно. Сегодня в качестве индикаторов можно использовать только данные социологических опросов. Результаты сентябрьского опроса НИСЭПИ показали, что 41,8% граждан (против 39,2%) считают, что места в парламенте были заранее определены властями. Инициаторы и активисты кампании "За справедливые выборы" не считают эти результаты очень убедительными и понимают, что нам еще есть над чем работать. И мы будем это делать, ибо хорошо понимаем, что победить режим громкими заявлениями, броскими спецэффектами и политическими трюками невозможно. Но правда обязательно победит.

Виктор КОРНЕЕНКО,
координатор кампании "За справедливые и свободные выборы".

ІНІЦЫЯТЫВА

Галасуем рублём!

Былыя кандыдаты ў дэпутаты парламента Аляксей Гаўруцікаў, Ігар Каныгін, Галіна Козырава і Алена Фаміна, якія балатаваліся ў парламент, але не прайшлі ў яго, прапаноўваюць правесці ў краіне серыю грамадзянскіх акцый, скіраваных супраць, як яны заяўляюць, фальсіфікацый падчас прайшоўшых 28 верасня 2008 года выбараў.

Як паведаміў БелаПАН А.Гаўруцікаў, першая акцыя стартуе ў кастрычніку гэтага года і называецца *"Галасуем рублём!"*. *"Сутнасць яе заключаецца ў наступным. Мы прапаноўваем выбаршчыкам аплачваць квартплату і камунальныя паслугі ў наступныя тэрміны: з 1 па 10 чысло кожнага месяца плацяць тыя, хто галасаваў за кандыдатаў ад улады. Затым, з 11-га па 20-е — плацяць тыя, хто галасаваў супраць усіх і хто не хадзіў на выбары, і з 21-га па 25-е — тыя, хто галасаваў за кандыдатаў ад апазіцыі і незалежных кандыдатаў. Такім чынам, усе мы разам пераканаемся, што прыхільнікаў перамен у краіне большасць"*, — лічыць А.Гаўруцікаў.

Паводле яго слоў, прадстаўнікі Еўрапейскай кааліцыі па Віцебскай вобласці таксама звярнуліся да лідэра аргкамітэта руху "За Свабоду!" Аляксандра Мілінкевіча з просьбай падтрымаць гэтую ініцыятыву.

Таццяна ЧАБАТАРОВА.

Алесь Бяляцкі: «Улады ўвогуле перасталі саромецца назіральнікаў»

Беларускія праваабаронцы сцвярджаюць, што зафіксаваныя імі факты парушэння заканадаўства і грубай фальсіфікацыі "выбараў" у Беларусі амаль немагчыма данесці да грамадскасці, і ўлады гэтым бессаромна карыстаюцца.

Незалежныя назіральнікі адчуваюць сябе на выбарах проста бездапаможна. Як сцвярджае віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека **Алесь Бяляцкі**, яны, *"маючы на руках неабвержныя доказы падману падчас падліку галасоў"*, нічога не могуць зрабіць. Вынікі іх назірання *"нікога не цікавяць і не палохаюць"*.

"У нас дзясяткі гэтых выпадкаў — сядзіць назіральнік, лічыць па галовах, у яго прагаласавала датэрмінова 150, у пратаколе пры падліку галасоў з'яўляецца лічба 450, 500, 600. Што гэта такое?! Ці гэта выбары?! Улады ўвогуле перасталі саромецца назіральнікаў — не толькі нас, але і міжнародных", — сцвярджае Бяляцкі.

Літоўскія журналісты, якія слухалі расповед беларускіх праваабаронцаў, больш за ўсё не маглі зразумець, чаму грамадства не цікавіцца адкрытым гвалтам улады над сабой — хоць падчас датэрміновага галасавання, на якое, паводле заўваг назіральнікаў, людзі былі загнаныя пераважна ў прымусовым парадку. Праваабаронцы маглі адказаць толькі красамоўнымі прыкладамі.

"Усе да гэтага ўжо зусім прызвычаіліся. Дапусцім, са Слуцка нам прыйшоў фотаздымак аб'явы ў школе: "Шаноўныя калегі, прагаласуйце датэрмінова, бо ўжо запатрабаваныя спісы настаўнікаў, што не прагаласавалі". Кім запатрабаваныя, навошта — можна толькі здагадвацца. Або ведамасці ў Баранавічах, дзе настаўнікі распісваліся проста, пасля таго як прагаласавалі датэрмінова", — гаворыць намеснік старшыні праваабарончага цэнтра "Вясна" Валянцін Стэфановіч.

Нагадваем: пададзеная ў Вільнюсе пазіцыя аб якасці беларускіх "выбараў" — гэта толькі адзін з пунктаў гледжання. Міжнародныя назіральнікі ад Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе *"выбары"* прызналі недэмакратычнымі, але ўгледзелі пэўны прагрэс у параўнанні з ранейшымі. А назіральнікі ад СНД ніякіх парушэнняў традыцыйна ўвогуле *"не заўважылі"*.

ПОГЛЯД

А ці ёсць што дзяліць дэмакратам?

Нягледзячы на адрозненні ў поглядах, прадстаўнікі беларускай апазіцыі могуць паспяхова супрацоўнічаць адзін з адным. Такую думку ў інтэрв'ю БелаПАН выказаў Часовы Паверaны ў справах ЗША ў Беларусі Джонатан Мур.

"Калі дэмакратычныя сілы аб'ядналіся, каб падтрымаць адзінага кандыдата на пасаду прэзідэнта на выбарах 2006 года Аляксандра Мілінкевіча, яны дабіліся вельмі многага, — лічыць Дж.Мур. — *Вельмі ўражвае, што тая ж самая група змагла пашырыцца, прыцягнуць іншых удзельнікаў і падала аб'яднаны спіс сваіх кандыдатаў на парламенцкія выбары"*.

Дыпламат упэўнены, што рашэнне часткі апазіцыі байкатаваць выбарчую кампанію было няправільным. *"Мы лёгка можам зразумець маральныя апраўданні для байкоту,* — сказаў Дж.Мур. — *Але байкот пазбавіў бы беларускіх грамадзян галоўнай магчымасці — магчымасці даведацца больш аб беларускай апазіцыі, аб яе людзях і іх палітычных планах"*. Пры гэтым Часовы Паверaны падкрэсліў, што кожны мае права зрабіць свой выбар, вырашыць, браць яму ўдзел у выбарах або не.

Што да перспектыў развіцця беларускага дэмакратычнага руху, то, як заявіў Дж.Мур, *"людзі Беларусі і прадстаўнікі дэмакратычных сіл павінны вырашыць, якім будзе наступны крок, як існаваць далей"*.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

НА СВАЕ ВОЧЫ

Людзі прагнуць перамен, але не вераць у іх

Лідэр ствараемага Руху "За Свабоду" Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ падчас агітацыйнай кампаніі ўдзельнічаў у 20 сустрэчах з выбаршчыкамі, арганізаваных дэмакратычнымі кандыдатамі ў дэпутаты ў розных кутках краіны. Больш за дваццаць кандыдатаў у дэпутаты запрасілі экс-кандыдата ў прэзідэнты выступіць у якасці даверанай асобы падчас агітацыйных сустрэч.

Зразумела, Мілінкевіч разглядаў гэтыя сустрэчы як дадатковую магчымасць для непасрэдных кантактаў з людзьмі і агучвання сваёй пазіцыі па важных грамадскіх, палітычных, сацыяльных і эканамічных пытаннях. Акрамя таго, не рабіў сакрэту з таго, што падчас сумесных сустрэч і выступаў з кандыдатамі адбываецца фарміраванне каманды, неабходнай для ўдзелу ў наступнай прэзідэнцкай кампаніі. І ўсё ж галоўная задача, якая ставілася, — данесці да людзей праўду пра сутнасць так званых "беларускіх выбараў". Як ні дзіўна, паводле сацыялагічных апытанняў, значная колькасць грамадзян увогуле нічога не ведала пра фальсіфікацыі падчас выбараў і давярала вынікам, якія ў мінулыя электаральныя кампаніі агучвала ЦВК.

Па паводзінах людзей, іх адносінах да парламенцкіх выбараў, пытаннях, якія яны задавалі кандыдатам і лідэру Руху "За Свабоду" падчас сустрэч, было бачна, што да простых людзей прыходзіць разуменне ўсёй заганнасці беларускай выбарчай сістэмы. Мабыць, таму сёлетняя выбарчая кампанія ў Палату прадстаўнікоў характарызавалася надзвычай нізкай палітызаванасцю людзей: на агітацыйныя сустрэчы з кандыдатамі звычайна прыходзіла 20—30 чалавек. Не цікавяцца палітыкай? Ды не! Людзі проста прызвычаіліся, што ў краіне ўсім кіруе адзін чалавек і ад іх волевыяўлення нічога не залежыць.

"Дзе гарантыя, што новы дэпутат пра нас не забудзецца, а будзе выконваць свае абяцанні?" — не раз пыталіся людзі на сустрэчах. Але высветлілася, што не толькі дэпутаты забываюць пра выбаршчыкаў, але і выбаршчыкі, як правіла, не здольныя ўзгадаць імя свайго *"абранца"*. На думку Аляксандра Мілінкевіча, так здараецца таму, што дэпутаты не абіраюцца, а прызначаюцца. Яны клапоцяцца пра тое, каб спадабацца таму, хто іх прызначыў, і ніякай адказнасці перад людзьмі не нясуць. І праўда, кандыдатка ў дэпутаты, галоўны ўрач горацкай бальніцы Алена Караед на сустрэчу з выбаршчыкамі Горацкай акругі наўпрост не з'явілася. Чаму? Ды таму, што ўжо па ходзе выбарчай кампаніі стала вядома, што прынята рашэнне пра яе вылучэнне ў Савет Рэспублікі. Навошта ёй цяпер выбаршчыкі?! Запрошаныя на сустрэчу кандыдата Аляксандра Меха з выбаршчыкамі дэпутат Кобрынскага райсавета і начальнік мясцовай ЖКГ таксама не прыйшлі. І такіх прыкладаў шмат. Ды і самі людзі ўсё больш занятыя сваім выжываннем і не вераць чыноўнікам. Так, сустрэча ў Бярозе з кандыдатам ад улады Яўгенам Казімірчыкам, якая мусіла адбыцца за 5 дзён да выбараў, была адменена. Ніхто на яе не прыйшоў, ні адзін выбаршчык!

Найбольш цікавыя і жывыя сустрэчы адбываліся ў невялікіх залах, абстаноўка якіх спрыяла больш шчырым размовам. Падчас паездак па рэгіёнах лідэр ствараемага Руху "За Свабоду" імкнуўся прадэманстраваць людзям, што ў Беларусі ёсць альтэрнатыва існуючай уладзе, што ёсць сумленныя людзі, здольныя адказна кіраваць краінай у новых умовах. *"У душах людзей пануе апатыя. Яны зараз ні ў што не вераць. Мы павінны адрадзіць веру людзей у свае магчымасці ўплываць на жыццё краіны"*, — неаднаразова падкрэсліваў Мілінкевіч. І не стамляўся паўтараць: улада павінна абірацца, а не прызначацца, павінны працаваць эфектыўныя механізмы грамадскага кантролю над уладай.

Што ж мы ўбачылі, паездзіўшы па ўсёй краіне?

Людзей, асабліва ў маленькіх гарадах, вельмі прыгнятае прымусова ўведзеная сістэма татальных кароткатэрміновых кантрактаў. Перад імі з'явілася змрочная перспектыва страты працы за любы неасцярожны крок, любое слова, якое не спадабаецца начальству. Цяжкасці з пошукам працоўнага месца ў правінцыі толькі ўскладняюць гэтую праблему.

Тых, хто мае дзяцей, вельмі хвалюе, што вышэйшая адукацыя паступова становіцца платнай. А дзяржава фактычна абвяшчае курс на зніжэнне агульнаадукацыйнага ўзроўню. Людзі вельмі занепакоеныя лядачым станам беларускай медыцыны, а таксама агульным ростам захворванняў. Прадпрымальнікі стогнуць ад непамернай падатковай нагрузкі. Яны прызнаюць, што вымушаны хаваць частку прыбытку, бо інакш не выжыць. Старых людзей цікавіць, як жыць на малую пенсію і чаму яны павінны збіраць даведкі і даказваць у райвыканкаме, што яны жабракі. Пенсіянеры вельмі абураюцца тым, што дэпутаты прынялі закон пра ўпарадкаванне льгот, ад якога пацярпелі самыя маламаёмасныя... Карацей, праблем не проста шмат, праблем — процьма.

Лідэр ствараемага Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч адзначаў пасля такіх гутарак, што людзі ўсё больш адчуваюць патрэбу ў пераменах: *"Прыходзіць разуменне, што неабходна не толькі захаваць усё лепшае з таго, што было, але і развівацца грамадству, мадэрнізаваць эканоміку."* Пры гэтым пытанне, як змяніць сітуацыю да лепшага, застаецца адкрытым. Людзі (праз аднаго) цікавіліся, навошта ісці на выбары, калі яны будуць сфальсіфікаваныя. Кандыдат па Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акрузе Аляксей Гаўруцікаў адказваў прыкладна так: зараз ідзе ціск Еўропы на Лукашэнку, улада вельмі зацікаўлена ў прызнанні выбараў, і *"цуд можа здарыцца"*. У сваю чаргу кандыдат прасіў выбаршчыкаў не ісці на датэрміновае галасаванне, рабіць свой выбар у асноўны дзень, каб было цяжэй здзейсніць фальсіфікацыі.

"Гэта наша місія палітыкаў. Мы павінны ўдзельнічаць у выбарах", — тлумачыў дэмакратычны кандыдат.

Цуд не здарыўся, але перадвыбарная кампанія — не марна патрачаны час.

На агітацыйных сустрэчах амаль заўсёды прысутнічалі прадстаўнікі ад "вертыкалі", якія спрабавалі збянтэжыць выступоўцаў нязручнымі пытаннямі. Пыталіся пра сітуацыю ў Партыі БНФ, стаўленне да НАТО, да абвяшчэння Абхазіяй незалежнасці; пра тое, дзе бяруцца грошы на палітычную дзейнасць. Аднак пасля спакойных, разважлівых размоў і з дэмакратычнымі кандыдатамі, і з Аляксандрам Мілінкевічам, і з актывістамі нават заўзятыя прыхільнікі Лукашэнкі ўздыхалі: "Абяцалі ўлады многае, але так нічога і не зрабілі..."

Простыя людзі ставіліся да дэмакратычных кандыдатаў амаль заўсёды прыязна. Яны самі, без усялякай дапамогі, лёгка абвяргалі довады *"засланцаў"* ідэалагічных аддзелаў райвыканкамаў фактамі са свайго жыцця, цёпла развіваліся з Мілінкевічам і актывістамі, абяцалі падтрымаць сваім голасам, зычылі перамогі і на гэтых выбарах, і на прэзідэнцкіх. Але, як выявілася, для таго, каб пераламіць сітуацыю да лепшага, быць сумленным выбаршчыкам недастаткова, а патрабаваць ад людзей гераізму не выпадае.

Арцём ЛЯВА.
Фота photo.bymedia.net

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ЛИКБЕЗ

Налоговые перемены для всех и каждого

Недавно в редакцию "Народнай воли" пришло письмо от читателя из Орши. Обычное письмо с обычными жалобами на тяготы белорусской жизни. Но один момент в нем обращал на себя особое внимание. Процитирую его: "В новостях часто говорят, что правительство снижает налоги. Но бухгалтера на нашем предприятии как стонали по поводу многочисленных и запутанных налогов, так и стонут. Однако недавно заговорили о том, что со следующего года резко снизится подоходный налог, который платим мы все. И что начисляться он будет как-то совершенно иначе. Вы можете разъяснить, чего нам ожидать на этот раз?"

Что ж, нам пришлось самим во всем разобраться. И вот что получилось.

Официально

2 октября Палата представителей приняла в первом чтении проект закона о внесении изменений и дополнений в некоторые законы по вопросам налогообложения. Основные изменения коснутся законов "О налоге на добавленную стоимость", "О подоходном налоге с физических лиц", "О налоге на доходы и прибыль", "О налоге на недвижимость", "О дорожных фондах в Республике Беларусь" и общей части Налогового кодекса.

Проект закона представлял министр финансов Андрей Харковец. По его словам, *"законопроект обеспечивает реализацию основных направлений бюджетно-налоговой политики на 2009 год, определенных с учетом поручения президента о необходимости упрощения налоговой системы"*. Главным нововведением, несомненно, стало изменение действующей шкалы подоходного налога — как утверждают в правительстве, "для дальнейшего совершенствования налогообложения доходов физических лиц".

Говоря проще, предложено установить линейную ставку в 12% по доходам, получаемым как по месту основной работы, так и в других местах. Величину стандартных налоговых вычетов установят в белорусских рублях и увеличат до 250.000 (по доходам, не превышающим 1,5 млн рублей в месяц). Кроме того, Совмин предложил установить по доходам индивидуальных предпринимателей линейную ставку подоходного налога в размере 15%. Это соответствует нынешнему уровню выплат при использовании упрощенной системы налогообложения (10% от выручки или единый налог по твердой ставке в зависимости от вида деятельности). Сегодня средняя ставка изъятия налога по индивидуальным предпринимателям — 16,3%.

Выступая в парламенте, Андрей Харковец заявил, что переход с прогрессивной шкалы на единую ставку подоходного налога позволит населению сэкономить за 2009 год 600 млрд рублей. Кроме того, нововведение не приведет к росту налогов для малообеспеченных категорий граждан.

По сути

Если не произойдет никаких изменений, то с 2009 года в Беларуси будет самая низкая ставка подоходного налога для физических лиц в Европе — 12%. До сих пор самой низкой она была в России (13%). При этом 12%-ный налог будет взиматься как по основному месту работы, так и на каждой из дополнительных работ. Сумма налогового вычета также меняется: если человек получает в месяц не более 1,5 млн рублей, подоходный налог не будет взиматься с суммы в 250 тыс. рублей (сейчас — 35 тысяч, т.е. одна базовая величина). Получается, что при доходе в 1,4 млн рублей подоходный налог будут взимать с 1,15 млн рублей.

Также отменяется подсчет суммы нарастающим итогом с начала года. С 2009-го подоходный налог будет исчисляться ежемесячно — это должно заметно упростить работу бухгалтеров. Сфера декларирования доходов для физических лиц максимально сократится. Также будет отменена выдача справки о налогообложении доходов при изменении в течение года основного места работы.

В правительстве уже подсчитали, что после введения 12%-ной ставки общие налоговые поступления в бюджет возрастут на 3%. Должна измениться и структура этих поступлений: с нового года основную часть (как предполагается, до 90%) будут обеспечивать граждане со средними и высокими доходами. За счет легализации доходов правительство ожидает дополнительного прироста поступлений подоходного налога не менее чем на 10—15%.

Предпосылки

Плоская шкала подоходного налога — новшество для Беларуси. С конца 90-х годов у нас применялась прогрессивная шкала налогообложения со ставками от 9% до 30%. Но такой подход больше свойственен экономически развитым странам, а не странам с переходной экономикой, к которым относится Беларусь.

Когда нынешний президент только пришел к власти, он декларировал, что как раз прогрессивное налогообложение больше всего соответствует принципам справедливости и "социальной ориентированности" белорусской экономики. Дескать, чем больше человек зарабатывает, тем больше он должен платить налогов, и наоборот.

Однако на практике получилось "как всегда": зарабатывать много легальным путем было невыгодно. Результатом непродуманного применения прогрессивной шкалы стал отток за рубеж капиталов и высококвалифицированных специалистов (во всех отраслях). Ну и, разумеется, расцвело уклонение от уплаты налогов, а зарплаты и сегодня очень много где платятся в пресловутых конвертах. Теперь в правительстве хоть и неохотно, но признают: основное налоговое бремя вынуждены нести как раз бедные и средние слои населения.

Кстати: не стоит думать, что нынешнее налоговое послабление вообще может заметно сказаться на бюджете страны. Дело в том, что в Беларуси доля подоходного налога в госбюджете стабильно снижается: с 2000-го по 2007 год "подоходные" поступления в доходах бюджета снизились с 11—12% до 9%. И это несмотря на постоянно декларируемый рост уровня оплаты труда и других доходов населения. Причину правительство видит как раз в действующей шкале налоговых ставок.

Основная налоговая нагрузка в нашей стране приходится на предприятия, и такая система в ближайшие годы сохранится неизменной. В развитых европейских странах ситуация диаметрально противоположная: там госбюджеты получают от своих граждан до 40% всех поступлений. Особо выделяются скандинавские страны, в которых подоходный налог намного выше, чем сейчас в Беларуси (в Швеции верхняя ставка доходит до 50%). Однако сравнивать белорусов со скандинавами как минимум некорректно: там и ВВП в разы выше, и доходы соответствующие.

И еще. В России уже в следующем году после введения плоской шкалы ставок подоходного налога поступления в бюджет выросли на 46% в номинальном и на 26% в реальном выражении. То же самое произошло и в других постсоветских странах — в Украине, Литве, Эстонии и т.д. И повсюду — прежде всего за счет легализации доходов.

Ну и, наконец, плоскую ставку подоходного налога намного проще применять на практике. Нет нужды ежегодно подавать налоговые декларации и проверять указанные в них данные. Исчезает проблема постоянного нарастания суммы налога с начала и до конца года и сложных расчетов, связанных с таким нарастанием.

Мнения

В правительстве полагают, что реформа нынешней системы подоходного налога позволит вывести из тени изрядную долю доходов граждан. Кроме того, более привлекательными станут условия работы для бизнеса. Хотя, конечно, общая налоговая нагрузка все равно останется очень высокой.

Еще в феврале нынешнего года, выступая на коллегии Министерства по налогам и сборам, премьер-министр Сергей Сидорский дал указание: *"Создать такую систему заработной платы, чтобы людям было выгодно работать и зарабатывать в Беларуси"*. Именно премьер первым публично заговорил о том, что из-за несовершенства налоговой системы за рубеж массово уезжают квалифицированные белорусские рабочие и строители, а также специалисты с высшим образованием.

Белорусский бизнес пока с оптимизмом относится к переходу на 12%-ную ставку подоходного налога. Так, председатель Минского столичного союза предпринимателей и работодателей Владимир Карягин считает: *"Это революция в системе налогообложения в Беларуси. [...] Еще год назад в финансовых органах говорили: не злите президента и правительство, выбросьте это ваше предложение, никто не пойдет на это. Нынешняя система сдерживала экономическую инициативу граждан, многие работали "в тени", не хотели декларировать реальные заработки, поскольку это было невыгодно"*.

Кандидат экономических наук, эксперт по налогообложению Валерия Герасимова уверена, что по-настоящему снизить налоговое давление на граждан одним только изменением шкалы подоходного налога не получится. Зарплат в конвертах, конечно, станет заметно меньше, но в целом налоговая проблема решена не будет. Цитата: *"Проблема серых заработков не столько в подоходном налоге, сколько в слишком высокой налоговой нагрузке на фонд оплаты труда для предприятий"*.

Действительно, обязательные страховые взносы в Фонд социальной защиты — своего рода завуалированный налог — пока еще неоправданно велики. Работодатели отдают на соцзащиту 36% от фонда оплаты труда предприятия. В 2009 году ставка обязательных страховых взносов снизится, но всего лишь на 1% — послаблением это назвать сложно. Получается, что если вывести зарплату "из тени", фонд оплаты труда вырастет — а значит, вырастут и обязательные отчисления предприятий в фонд соцзащиты. То есть "белые" зарплаты как были невыгодными для работодателей, так и останутся таковыми.

Кто-то против

Против налоговых нововведений пока выступают в основном мелкие предприниматели. Экономист Василий Шлындиков считает, что новый закон не облегчит жизнь предпринимателей, так как власти будут действовать по старому принципу: облегчив в одном месте, утяжелят в другом. Цитата: *"Для людзей, якія шмат працуюць, гэта добра, не трэба будзе шукаць магчымасцяў, каб схаваць прыбытак. Але прадпрымальнікі ў нас яшчэ плацяць фіксаваны падатак, ён вельмі розны, у кожнага прадпрымальніка свой, у залежнасці ад віду дзейнасці. Таму ў цэлым яны будуць плаціць больш. Я сумняваюся, што фіксаваны падатак будзе ліквідаваны. У нас яшчэ не было такога выпадку ў Беларусі, каб падаткі памяншаліся"*.

В свою очередь лидер республиканского объединения "Перспектива" Анатолий Шумченко уверен, что введение 15% подоходного налога для индивидуальных предпринимателей против 12% для физических лиц — это дискриминация. В интервью Радыё Свабода Шумченко сказал: *"Нас, прадпрымальнікаў, гэта абсалютна не здзіўляе, бо дзяржава сёння будзе лупіць грошы адусюль, адкуль магчыма. І было б наіўна чакаць, што дзяржава не возьме з прадпрымальнікаў больш, чым з астатніх. [...] І тут ёсць ідэалагічны падтэкст, бо простаму насельніцтву лягчэй будзе патлумачыць, чаму прадпрымальнікі павінны плаціць больш — бо яны багатыя, больш зарабляюць і павінны падтрымліваць больш бедныя слаі нашага насельніцтва. Таму тут усё выверана, і дзяржава такім чынам спрабуе ўзяць з нас дадатковыя грошы"*.

Виктор ДЕМИДОВ.

ЦИФРЫ

В 2007 году предельный уровень годового дохода, по которому установлена наименьшая ставка налога — 9%, составлял 7520 тыс. рублей, или 627.000 в месяц. Это 89,4% от официального уровня среднемесячной зарплаты за 2007 год (701 тыс. рублей) в Беларуси. Получалось, что доходы большей части населения облагаются налогом по минимальной ставке, а высокие предельные ставки в реальности просто не работают.

Сегодня, по статистике, основная часть подоходного налога выплачивается группами населения, доходы которых облагаются по ставкам 9% и 15% (в среднем — 12,6%). При этом белорусы, уровень зарплаты которых превышает средний в 3—4 раза, обеспечивают всего 9,1% поступлений в бюджет.

По оценкам зарубежных экспертов, удельный вес теневой экономики в Беларуси составляет не менее 25%. (Попутно замечу, что это меньше, чем в России (34%) и Украине (44%)). Но, по данным официальной белорусской статистики, неучтенные доходы от предпринимательской и прочей деятельности в последние годы стабильно составляют 10—12% ВВП и 21—26% доходов, полученных в форме зарплаты, пенсий, пособий, стипендий, доходов от собственности и т.д.

Расія ўводзіць новыя абмежаванні на пастаўкі беларускіх прадуктаў харчавання

Уведзеная Россельгаснаглядам для шэрагу прадпрыемстваў Беларусі забарона на пастаўку ў РФ прадукцыі жывёлагадоўлі ўступіла ў сілу 1 кастрычніка.

Акрамя таго, падчас інспекцый на прадпрыемствах "Смалевіцкая бройлерная птушкафабрыка" і СПК "Прагрэс-Верцелішкі" былі выяўленыя недахопы, якія не дазволілі ўключыць іх у спіс беларускіх прадпрыемстваў, якія маюць права пастаўляць сваю прадукцыю ў Расію.

Праверкі праводзіліся з 18 па 30 жніўня разам з прадстаўнікамі беларускай ветэрынарнай службы на 35 беларускіх прадпрыемствах па перапрацоўцы прадукцыі жывёлагадоўлі. *"Па выснoвах, якія зрабілі эксперты Россельгаснагляду, падчас інспекцый былі выяўленыя сістэмныя недахопы дзяржаўнага ветэрынарнага кантролю пры вытворчасці такой прадукцыі, — адзначаецца ў дакуменце. — Вынікі інспекцыі сведчаць аб фармальным падыходзе беларускага боку пры рэкамендацыі прадпрыемстваў на атрыманне права пастаўкі прадукцыі ў Расію"*.

У гэтай сувязі Россельгаснагляд звярнуўся да галоўнага ўпраўлення ветэрынарыі Беларусі з просьбай у найкарацейшыя тэрміны перагледзець спіс беларускіх прадпрыемстваў, якія пастаўляюць прадукцыю жывёлагадоўлі ў Расію, і прадставіць Россельгаснагляду актуалізаваны спіс прадпрыемстваў, якія рэальна выконваюць у поўным аб'ёме расійскія ветэрынарна-санітарныя патрабаванні.

Беларускі рынак ПК — адзін з найбуйнейшых у СНД

Аб'ёмы рынкаў персанальных камп'ютэраў краін СНД — Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Кіргізіі, Малдавіі, Таджыкістана, Туркменіі і Узбекістана — у суме складаюць больш за 1,1 млн прылад, што адпавядае 954,6 млн долараў ЗША. Сярэднегадавы тэмп росту рынкаў у гэтых краінах у 2007 годзе склаў 27,5%, што нашмат вышэй, чым у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, паведамляе аналітычная кампанія IDC.

Рынкі ПК ва ўсіх краінах СНД развіваліся вельмі хутка. Найбуйнейшы рынак ПК — казахстанскі (яго аб'ём больш 473 тыс. шт), наступны па аб'ёме — беларускі (232 тыс. шт). Аднак тэмпы росту рынкаў у гэтых краінах не так высокія, як маглі бы быць, — першая значна папакутавала ад сусветнага крызісу ліквіднасці, а другая — ад павышэння Расіяй коштаў на энерганосьбіты. Акрамя таго, далягляды для пастаўшчыкоў ПК у Грузіі і Арменіі ў выніку нестабільнага палітычнага становішча ніжэй сярэдніх па краінах СНД.

Па прагнозе аналітыкаў, агульны аб'ём паставак ПК на рынкі краін СНД (без уліку Расіі і Украіны) будзе расці ў сярэднім на 17,3% штогод і перавысіць да канца прагназуемага перыяду (2012 год) 2,5 млн штук. Найбуйнейшым рынкам СНД застанецца Казахстан, дзе аб'ём паставак ПК у 2012 годзе перавысіць мільён штук.

Бюджэт вытрымае новыя кошты на газ?

Калі кошт на расійскі газ будзе вышэй запланаванай адзнакі, "бюджэт здолее адаптавацца да новага ўзроўню коштаў". Аб гэтым заявіў 2 кастрычніка міністр фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец, адказваючы на пытанні журналістаў.

Міністр пацвердзіў, што пры разліках выдаткаў бюджэту закладзены кошт на газ у памеры 140 долараў ЗША за 1 тыс. кубаметраў. Калі кошт будзе вышэй, "у нас ёсць комплекс адпаведных мер, і гэта не з'яўляецца вялікай праблемай", сказаў Харкавец. Па ягоных словах, падчас перамоў з Расіяй гаворка ідзе аб мінімальным росце коштаў на газ, бо "ёсць шэраг фактараў, якія гэтаму спрыяюць".

Тады ж, 2 кастрычніка, у інтэрв'ю агенцтву "Інтэрфакс" амбасадар Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў не выключыў, што кошт расійскага газу для Беларусі ў 2009 годзе можа скласці каля 250 долараў за тысячу кубаметраў. "Калі груба па формуле цяпер прыкінуць, то кошт газу для Беларусі атрымліваецца каля 250 долараў за тысячу кубаметраў", — сказаў дыпламат.

Ён таксама нагадаў, што ў адпаведнасці з падпісаным у 2006 годзе чатырохгадовым кантрактам кошт газу для Беларусі ў 2009 годзе складзе 80% ад кошту паставак газу ў Польшчу за вылікам экспартнай мыты ў памеры 30%. У кошце таксама ўлічваецца розніца паміж коштам транзіту газу ў Польшчу і ў Беларусь.

«Прыватнікаў» могуць пусціць у прамысловасць?

Аляксандр Лукашэнка лічыць магчымым шырэйшае прыцягненне прыватнага бізнесу ў розныя галіны беларускай прамысловасці для стварэння канкурэнтных умоў.

"Сёння сітуацыя такая, што мы можам цалкам пусціць прыватніка. Бо сітуацыя ў краіне кіруемая", — заявіў Лукашэнка, наведваючы ААТ "Гомельшкло". Кіраўнік дзяржавы лічыць, што для дзяржаўных прадпрыемстваў неабходна стварыць канкурэнтнае асяроддзе, прыцягваючы прыватны капітал для арганізацыі аналагічных прадпрыемстваў.

Урад павінен інвеставаць у рэальныя праекты

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка патрабуе, каб урад інвеставаў вольныя сродкі ў рэалізацыю рэальных праектаў. "Сродкі трэба ўкладваць у рэальныя праекты, у вытворчасці, якія адбыліся, у людзей", — заявіў Лукашэнка ў Гомелі на нарадзе па пытаннях развіцця шкляной прамысловасці.

"У нас ёсць вызначаная сума грошай, але я ўсё часцей чую ад урада: дайце праекты, а мы іх прафінансуем", — сказаў кіраўнік дзяржавы. У той жа час, па ягоных словах, кіраўнікі шклозаводаў займаюцца пошукам фундатараў для завяршэння мадэрнізацыі сваіх прадпрыемстваў. *"Дык чаму гэтыя грошы не накіраваць сюды? Бо гэтыя праекты не выдуманыя, амаль не рызыкоўныя"*, — заўважыў Лукашэнка. Па яго словах, вольныя сродкі неабходна без прамаруджвання інвеставаць у вытворчасць. *"На гэта адпушчана 2—3 гады, не больш"*, — сказаў прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што гэта звязана з нестабільнасцю на сусветным фінансавым рынку. *"Мы не так моцна папакутавалі ад гэтага крызісу, але варта ўлічваць, што сусветны фінансавы рынак будзе дэманапалізаваны, яго перакроюць яшчэ не адзін раз"*, — сказаў беларускі прэзідэнт. У гэтай сувязі кіраўнік дзяржавы ў чарговы раз адзначыў неабходнасць укладання вольных грошай у *"развіццё вытворчасці, якая не залежыць ад імпарту сыравіны"*. Гэта, па словах Лукашэнкі, датычыцца не толькі шкляной прамысловасці, але і дрэваапрацоўкі, перапрацоўчай прамысловасці ды шэрагу іншых.

Расійскія рэйдэры не павінны мець волі ў Беларусі

Спробы расійскіх рэйдэрскіх нападаў (калі яны маюць месца) на тэрыторыі Беларусі павінны быць перарваныя, заявіў агенцтву "Інтэрфакс " прэс-сакратар дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Ян Макушок.

Ён адзначыў неабходнасць узмацнення кантролю над магчымымі спробамі нападаў на беларускія прадпрыемствы расійскіх рэйдэрскіх структур. *"Неабходна зрабіць усё, каб рэйдэрскія напады не перакінуліся на тэрыторыю ўсёй Саюзнай дзяржавы і не аказалі негатыўнага ўплыву на развіццё эканомікі Беларусі"*, — падкрэсліў ён. Пры гэтым Макушок заўважыў, што рэйдэры *"падарвалі працу ўжо шматлікіх прадпрыемстваў у Расіі, якія добра працавалі"*.

Дапрацоўваецца Кодэкс аб зямлі

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі будзе дапрацаваны, у яго будуць занесеныя змены і дадаткі. Такое рашэнне прыняла Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Змены ў Кодэкс аб зямлі заснаваныя на пярэчаннях прэзідэнта па асобных палажэннях дадзенага заканадаўчага акта.

Як адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Міхаіл Русы, Кодэкс аб зямлі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем асобных палажэнняў, падпісаў прэзідэнт 23 ліпеня бягучага году. У адпаведнасці з Канстытуцыяй асобныя палажэнні Кодэкса вернутыя кіраўніком дзяржавы ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу для паўторнага разгляду і галасавання. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што ў шэрагу палажэнняў Кодэкса замацоўваецца магчымасць атрымання зямельных участкаў на праве пажыццёвага спадчыннага валодання замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства пры іх атрыманні ў спадчыну. Улічваючы абмежаваную зваротаздольнасць зямельных участкаў (могуць знаходзіцца ў прыватнай уласнасці толькі грамадзян Беларусі), будзе абгрунтавана падаць магчымасць атрымання зямельных участкаў на праве прыватнай уласнасці або на праве пажыццёва спадчыннага валодання замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства. Гаворка ідзе аб тых замежных грамадзянах, якія знаходзяцца ў роднасных адносінах са спадкаемцам зямельнага ўчастка. У гэтай сувязі неабходна вызначыць вычарпальны круг такіх асоб у Кодэксе аб зямлі.

Прапанавана таксама дапрацаваць і ўзгадніць яшчэ адну прапанову, якая прадугледжвае пакрыццё страт, што прычыняюцца землекарыстальнікам. У Кодэксе будуць вызначаныя ўмовы пакрыцця страт.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Райс в Астане

Президент Казахстана Нурсултан Назарбаев и государственный секретарь США Кондолиза Райс обсудили широкий круг вопросов международного и регионального характера, сообщила пресс-служба администрации президента Казахстана.

"В центре внимания были вопросы нормализации ситуации в Афганистане, стабилизации обстановки в Ираке, урегулирования кавказского конфликта", — говорится в сообщении пресс-службы, распространенной по итогам встречи. Кроме того, "важной темой переговоров были и перспективы развития Центрально-азиатского региона".

В ходе обсуждения казахстанско-американских отношений было отмечено, что они носят многоплановый характер и имеют хорошую динамику развития. "В настоящее время Казахстан рассчитывает на то, что американский бизнес будет инвестировать не только в нефтегазовый сектор нашей экономики, но и в другие отрасли — сельское хозяйство, телекоммуникации, транспорт", — отмечается в сообщении.

США являются одним из крупнейших торговых партнеров Казахстана. По итогам шести месяцев 2008 года товарооборот двух стран превысил 1,1 миллиарда долларов.

Серия землетрясений

Серия землетрясений поразила Афганистан и территории Киргизии, Таджикистана, Узбекистана. Геологическая служба США зафиксировала толчок силой почти шесть баллов утром в центре Афганистана южнее Кабула. Поступила информация о сильнейшем землетрясении на юге Киргизии. Сообщается о гибели людей и разрушении 120 домов. Спустя несколько минут землетрясение силой почти шесть баллов произошло и в Синцзян-Уйгурском автономном районе на северо-западе Китая.

Взрыв в Шри-Ланке

Взрыв, устроенный смертником в городе Анурадхапура на Шри-Ланке, унес жизни более 25 человек, включая бывшего высокопоставленного армейского генерала, сообщило министерство обороны этой страны. Ранения получили не менее 65 человек.

По словам представителей властей, смертник взорвал себя в офисе Объединенной национальной партии рядом с автобусной станцией.

Вместе с генерал-майором Джанакой Перерой, который являлся одним из видных деятелей оппозиции, во взрыве погибла его супруга.

Впервые в истории

Группа парашютистов из разных стран впервые в истории совершила прыжок над высочайшей вершиной мира.

Три любителя приключений из Великобритании, Новой Зеландии и Канады пролетели около минуты в свободном падении, выпрыгнув из самолета над Эверестом на высоте около 9 тысяч метров.

Раскрыв купола парашютов, они еще некоторое время парили вдоль склона горы и приземлились на площадке на высоте около 4 тысяч метров над уровнем моря, где их ждали сотни местных жителей, журналистов и туристов.

Высота Эвереста составляет 8848 метров. На подготовку беспрецедентного прыжка спортсмены потратили 15 лет и по 24 тыс. долларов личных денег. Холли Бадж считает, что игра стоила свеч. Еще 29 человек стоят в очереди на повторение достижения первой тройки.

ФИНАНСОВЫЙ КРИЗИС

Поможет, не поможет?

Эксперты о планах США по спасению мировой экономики

После серии драматических событий на Капитолийском холме и на Уолл-стрит американские законодатели дали добро на крупнейший в истории страны финансовый эксперимент, выделив больше 700 миллиардов долларов на выкуп обесценившихся активов банков. Это самая крупная и самая критикуемая из серии пока безуспешных попыток вернуть к жизни застывшие каналы кредитования и предотвратить крах крупных финансовых институций.

Судьба законопроекта оказалась под вопросом после того, как члены Палаты представителей во время первой попытки голосования неожиданно для многих отвергли его. Лишь после обвального падения курсов акций на Уолл-стрит, поставленного им в вину, законодатели дали добро.

— Есть ли признаки того, что эти беспрецедентные меры могут сработать? — этот вопрос Радио Свобода адресовала профессору экономики Михаилу Бернштаму.

— Пока признаков нет, говорить об этом рано. Пока есть признаки того, что все кредитные рынки полностью замерзли, потому что цена кредита очень и очень высока. Банки не могут получить кредит. Правительство Калифорнии — колоссального штата, колоссальной экономики — не может получить кредит. Бизнес испытывает очень большую трудность при размещении своих краткосрочных облигаций, для того чтобы получить оборотный капитал просто на выплату заработной платы. Предполагается, что эти меры плюс возможное снижение ставки разморозит кредит. Таково сейчас требование дня.

— И все это происходит на фоне резко ухудшающейся экономической ситуации.

— Совершенно верно, финансовый кризис перерастает в общеэкономическую рецессию. Все показатели индексов будущего производства указывают, что рецессия уже началась, причем и в США, и в Европе.

— При этом эксперты сомневаются, что эти меры помогут оживить экономику.

— Эти меры помогут оживить экономику не сразу и уже не смогут предотвратить рецессию. Цель Министерства финансов США и Федеральной резервной системы в том, чтобы рецессия была короткой и не такой глубокой.

Экстренное одобрение беспрецедентного пакета стимулирования финансовой системы стало заметным политическим событием. Вот что думает об этом Лоуренс Маккуиллан, директор Центра "За предпринимательство" при исследовательском институте Pacific в Сан-Франциско:

— Как вы в целом оцениваете роль плана Полсона?

— Это действительно исторический момент. Решение выделить из казны 700 миллиардов долларов для спасения финансового сектора — первое такого рода со времен Второй мировой войны. Без этих 700 миллиардов мы бы в ближайшие дни увидели сотни, а то и тысячи банкротств предприятий и банков, стремительный рост безработицы и скатывание к депрессии типа той, что мы пережили в 30-х годах прошлого века. Возможно, правительство скоро попросит еще, и 700 миллиардов дойдут до одного или даже двух триллионов.

Экстренный мини-саммит

Пересмотреть бюджет Евросоюза в связи с мировым финансовым кризисом — такое решение приняли лидеры стран ЕС, входящих в Большую восьмерку. Они провели экстренный мини-саммит в Париже. Французское предложение о создании фонда помощи в размере 400 миллиардов долларов было отклонено. Всем странам Евросоюза придется самостоятельно решать возникающие проблемы. Однако при этом они должны координировать свои действия с другими членами ЕС.

Участники саммита — главы Великобритании, Германии, Италии и Франции — обратились к Еврокомиссии с призывом проявлять большую гибкость и не санкционировать те страны, которые в борьбе с кризисом помогают собственным финансовым институтам. Об этом заявил на пресс-конференции по итогам саммита президент председательствующей в ЕС Франции Николя Саркози.

Участники саммита договорились также о применении санкций против руководителей банков, проводящих неверный курс.

В работе саммита принимали участие председатель Еврокомиссии Жозе Мануэл Баррозу, глава Европейского Центробанка Жан-Клод Трише, а также премьер и министр финансов Люксембурга Жан-Клод Юнкер — глава Еврогруппы, объединяющей министров финансов стран еврозоны.

Почти 100-процентная гарантия

В Берлине на заседании кризисной группы по спасению от банкротства мюнхенского ипотечного банка Hypo Real Estate (HRE) канцлер ФРГ Ангела Меркель заявила о намерении правительства разработать и внедрить в самое ближайшее время модель полной государственной гарантии по частным вкладам.

"Мы обещаем вкладчикам, что их сбережения будут надежно защищены", — цитирует слова Меркель информационное агентство dpa. По словам министра финансов ФРГ Пера Штайнбрюка, ни один гражданин Германии не должен беспокоиться за судьбу вкладов. "Мы позаботимся о том, чтобы немецкие вкладчики не потеряли ни единого евро", — заявил министр.

Папа Римский о бесполезности денег

Глобальный финансовый кризис свидетельствует о бесполезности денег и тщетности накопления материальных ценностей, заявил Папа Римский Бенедикт XVI. Об этом сообщает агентство "Ассошиэйтед Пресс". По его словам, "единственной твердыней является слово Божие".

"Крах крупных банков показал, что деньги исчезают, они ничто. Все вещи, кажущиеся реальными, фактически оказываются второстепенными", — сказал понтифик. При этом Бенедикт XVI призвал всех, кто строит свою жизнь, "основываясь на удаче, карьере, деньгах", учитывать это.

Глобальный финансовый кризис многие западные СМИ уже назвали самым серьезным со времени Великой депрессии в США. Из-за дефицита ликвидности крупные банки по всему миру списали активы на общую сумму в 520 миллиардов долларов. При этом некоторые из них вынуждены были пойти на слияние с другими финансовыми организациями.

Для противостояния финансовому кризису Центробанки развитых стран мира объявили об объединении усилий и предоставлении расширенных краткосрочных кредитов своим банкам. В частности, Европейский Центробанк и Банк Англии стали предлагать банкам по 40 миллиардов евро на аукционах рефинансирования. Правительство Германии и ведущие банки страны предоставили 50 миллиардов евро кредита второму по величине немецкому ипотечному агентству Hypo Real Estate.

ФОТОВЗГЛЯД

Европейские и азиатские рынки продолжили падение, несмотря на попытки США и Европы поддержать свои финансовые системы.

В городе Дубай готовятся строить город будущего, который обойдется в 95 млрд долларов.

Француженка Франсуаза Барр-Синусси получила нобелевскую премию за работы, которые помогают искать методы борьбы со СПИДом.

ЧЕХИЯ

По ПРО

Парламент Чехии может приступить к ратификации чешско-американских договоров по ПРО в ноябре, заявил в интервью РИА Новости председатель Палаты депутатов (нижняя палата) парламента Чехии Милослав Влчек.

"Мы предполагаем, что правительство Чехии предложит нам все документы для ратификации договоров по ПРО в ноябре месяце этого года", -- сказал он.

Влчек полагает, что процесс ратификации будет непростым, так как "договоры по ПРО США скорее всего пройдут или не пройдут одним-двумя голосами депутатов".

"Если документы пройдут в парламенте с перевесом в один-единственный голос -- это все, безусловно, законно, но тогда возникает вопрос с легитимностью, потому что 66% населения было против этого", -- говорит председатель Палаты депутатов.

Он считает также, что "вообще нет смысла начинать процесс ратификации до тех пор, пока не будет ясно, кто станет новым президентом США. Вполне возможно, что новый американский президент будет решать вопросы безопасности иным способом". Госсекретарь США Кондолиза Райс и министр иностранных дел Чехии Карел Шварценберг подписали 8 июля в Праге основной договор о размещении на чешской территории американского радара системы противоракетной обороны (ПРО). 19 сентября в Лондоне министр обороны Чехии Власта Парканова и глава Пентагона Роберт Гейтс подписали второй документ по ПРО -- договор об условиях пребывания в стране американских военнослужащих (SOFA), которые будут находиться на базе ПРО США.

На чешском полигоне Брды появится огромный шар -- радар высотой 30 метров. Территория под американский объект ПРО уже ограждена и охраняется чешскими военнослужащими. Радар должен быть готов к эксплуатации к 2014 году.

Планы размещения в Чехии базы ПРО США давно разделили чешских политиков на два лагеря. За ратификацию в Палате депутатов выступает правящая Гражданская демократическая партия, которая не имеет в парламенте большинства. Часть депутатов от Партии зеленых, входящих в правящую коалицию, не согласна с размещением радара. Ведущая оппозиционная Чешская социал-демократическая партия требует проведения референдума по данному вопросу и намерена голосовать против.

На сроки размещения американских ПРО в Европе может повлиять экономический кризис в США, утверждает министр иностранных дел Чехии Карел Шварценберг. По его мнению, в связи с проблемами в американской экономике, размещение комплексов противоракетной обороны может быть отодвинуто на более поздний срок.

Чешские власти обсуждали этот вопрос с обоими кандидатами на должность президента США -- демократом Бараком Обамой и республиканцем Джоном Маккейном. Оба участника предвыборной гонки заявили, что намерены приложить усилия для развития этого проекта, "имеющего важное значение как для национальной безопасности США, так и для Европы". При этом Шварценберг предположил, что в случае прихода к власти Обамы размещение элементов ПРО в Восточной Европе произойдет позднее, чем если в Белый дом придет Маккейн.

ЧТО ТАМ, ЗА БУГОМ?

Генерал своей вины не признает

В Польше продолжается судебный процесс по делу о введении военного положения в стране в 1981 году. Главный обвиняемый — бывший глава государства Войцех Ярузельский — начал давать показания. "Господин генерал, правда победит! Здоровья вам и выдержки!" — такими словами приветствовали генерала Войцеха Ярузельского сторонники, собравшиеся в зале суда. Это, видимо, придало сил 84-летнему бывшему первому секретарю ЦК Польской объединенной рабочей партии, премьер-министру и министру обороны ПНР, который выступил в суде с 4-часовой речью. Своей вины Войцех Ярузельский не признал.

"То драматическое решение было вызвано высшей необходимостью и спасло Польшу от огромной катастрофы". Под катастрофой Ярузельский имел в виду введение в Польшу для подавления массовых протестов, организованных профсоюзом "Солидарность" дополнительного контингента войск Варшавского Договора. "Нет сомнений, — продолжил генерал, — что вооруженная интервенция или возможное внутреннее столкновение вызвали бы значительно более жесткие репрессии и страдания народа, чем то, что имело место во время военного положения".

Военное положение было введено в Польше в ночь на 13 декабря 1981 года на фоне массовых протестов рабочих и активной деятельности 10-миллионного профсоюза "Солидарность". В результате введения военного положения были арестованы и интернированы тысячи оппозиционеров. Во время подавления акции протеста погибли около ста человек.

Бал президентов

Медведев, Буш и Саакашвили могут встретиться на балу в Варшаве.

Президент Польши Лех Качиньский с большим размахом организует бал президентов -- специальные приглашения были высланы главам государств, причем не только Европейского Союза, всего — в 55 адресов.

"Около 20 глав государств уже подтвердили нам, что прибудут на торжества в Варшаву", — сообщил журналистам глава канцелярии президента Польши Петр Ковнацкий.

Бал состоится 11 ноября по случаю 90-й годовщины восстановления независимости Польши. Среди приглашенных — президент РФ Дмитрий Медведев, президент США Джордж Буш и президент Грузии Михаил Саакашвили. Торжества начнутся у могилы Неизвестного солдата в Варшаве, затем гостей ждут на ланч в Королевском замке. Вечером 11 ноября пройдет собственно бал президентов в Большом театре.

КАЛЕЙДОСКОП

Хор жалобщиков

В Германии получает все большую популярность новый музыкальный жанр — "хоровое пение жалобщиков", сообщило Reuters. Немецкие музыканты объединяются, чтобы петь о самых разнообразных проблемах: плохой погоде, супружеской неверности, отвратительной работе коммунальных служб и недальновидных политиках.

Reuters отмечает, что отличительная особенность "хоров жалобщиков" состоит в том, что надо петь о наболевшем весело и мажорно. Например, в Кельне 140 музыкантов-любителей выступают прямо на улицах, радостно воспевая проблемы городского быта. "Хор жалобщиков" стал настолько популярен, что кельнская филармония теперь периодически приглашает "нытиков" на свою сцену, и выступления хора проходят с аншлагами. Отмечается, что кельнский хор — самый многочисленный в мире. Творчество коллектива постоянно освещается в германских СМИ.

Первый в мире "хор жалобщиков" появился в британском Бирмингеме в 2005 году. Позже такие коллективы появились в Финляндии, Венгрии, Сингапуре, США.

Антинобелевские премии

В Гарвардском университете состоялась 18-я церемония вручения Антинобелевских премий за самые сомнительные и нелепые научные открытия, сообщает сайт NewScientist.com.

Антинобелевскую премию по химии получила Дебора Андерсон из Медицинской школы Гарварда за исследование об использовании "кока-колы" в качестве средства контрацепции. "Душ из "кока-колы" в качестве средства контрацепции применялся в 1950-е и 1960-е годы. Считалось, что углекислый газ обладает спермицидными свойствами", — пояснила Андерсон, решившая проверить гипотезу. Эксперимент показал, что "кока-кола" действительно оказывает определенный эффект, особенно диетическая. Тем не менее Андерсон считает, что полагаться на нее все же не следует. Любопытно, что другую Антинобелевскую премию по химии получили исследователи из Тайваня, чьи тесты показали противоположный результат и доказали, что ни "кока-кола", ни "пепси" вообще не обладают спермицидными свойствами.

Антинобелевская премия была учреждена юмористическим журналом "Анналы невероятных исследований" и вручается за достижения, которые "сначала заставляют людей смеяться, а потом думать".

Самый толстый

Мексиканец Мануэль Урибе, попавший в Книгу рекордов Гиннесса как самый толстый человек в мире, заявил, что в октябре намерен жениться. Об этом сообщает "Ассошиэйтед Пресс".

Супругой Урибе станет вдова Клаудия Солис, муж которой, как ранее сообщалось, скончался от сердечного приступа, спровоцированного ожирением. Она переехала к Урибе в конце прошлого года и помогала ему делать упражнения для похудения.

По информации AFP, спонсировать это мероприятие будут иностранные журналы, телевидение и местные власти, на средства которых приготовят торт на 400 гостей.

В феврале Урибе рассказал, что сбросил 230 килограммов. Прежде он весил 590 килограммов. Урибе, которому сейчас 43 года, начал по неизвестным причинам набирать вес после 20 лет. Он передвигается на специально сконструированной для этого кровати.

Закурил? Плати штраф

2 октября Индия отметила день рождения Махатмы Ганди введением самых жестких в мире штрафов за курение в общественных местах. Об этом пишет газета The Times.

С этого дня индийцам запрещено курить в барах, офисах, на автобусных остановках и в других подобных местах под угрозой штрафа в размере 200 рупий (2,4 фунта стерлингов), что составляет размер дневного заработка многих жителей страны.

Нововведению серьезно сопротивлялись производители сигарет и владельцы баров, однако правительство не обратило внимания на их доводы. По официальным данным, 40 процентов заболеваний в Индии так или иначе связаны с курением табака. В настоящее время из 1,2 миллиарда населяющих страну людей курильщиками являются около 250 миллионов. Растет число курящих женщин.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

СКАНДАЛ

«А на халеру тая рэгістрацыя?..»

Як вядома, упраўленне рэгістрацыі і класіфікацыі кіна- і відэапрадукцыі пры Міністэрстве культуры адмовіла ў рэгістрацыі тэлеспектакля "Тутэйшыя", знятага па замове тэлеканала "Белсат". Тэлеканал абвінавачвае кінематаграфічнае чынавенства ў прадузятасці. А вось аўтар тэлеспектакля знакаміты рэжысёр Валерый Мазынскі лічыць, што спроба рэгістрацыі — непатрэбная правакацыя.

Дакументы на рэгістрацыю тэлеспектакля былі пададзены ў ліпені. Некалькі месяцаў чыноўнікі адцягвалі рашэнне, а пад канец верасня прыйшоў адказ.

"Па-першае, якасць самога фільма, якасць гуку — нядобрыя, ёсць пабочныя шумы, — пракаментаваў адмову ў рэгістрацыі "Тутэйшых" намеснік начальніка кіравання рэгістрацыі і класіфікацыі кінавідэапрадукцыі дэпартамента па кінематаграфіі **Уладзімір Глускер**. — *Па-другое, канцоўка фільма не адпавядае арыгінальнаму твору "Тутэйшыя" Янкі Купалы, яна трохі адрозніваецца ад таго, што было ў арыгінальным тэксце".*

Ён падкрэсліў, што рашэнне было калегіяльным: яго прыняла класіфікацыйная камісія адпаведнага кіравання і экспертная рада дэпартамента.

"У дадзеным фільме скажаецца сэнс і мастацкая скіраванасць твора народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, што стварае ў гледача няверное ўяўленне аб творчасці класіка беларускай літаратуры, закранае яго годнасць, — удакладніў начальнік Упраўлення рэгістрацыі класіфікацыі кінавідэапрадукцыі дэпартамента кінематаграфіі **Уладзімір Курловіч**. — *У фінальнай частцы фільма мае месца праява шавінізму і нацыянальнай выключнасці, што недапушчальна".*

На думку кіраўніцтва тэлеканалу "Белсат", прычыны нерэгістрацыі значна глыбейшыя. Тэлеспектакль "Тутэйшыя", зняты **Валерыем Мазынскім** і **Дарыюшам Шада-Бажашкоўскім**, амаль дакладна ідзе за арыгінальным тэкстам Купалавай трагікамедыі.

"Рэжысёры імкнуліся эмацыянальна і вобразна перадаць атмасферу Мінска пачатку XX стагоддзя. "Тутэйшыя" і праз 80 гадоў не страцілі актуальнасці. Да апошняга часу вялікай папулярнасцю карыстаўся гэты спектакль, які знялі з рэпертуару Купалаўскага тэатра", — адзначаюць у прэс-службе "Белсата".

На думку самога Валерыя Мазынскага, спасылкі на якасць фільма і неадпаведнасць арыгіналу — афіцыйная версія адмовы. Рэальная прычына — у другім.

"Як сказалі тым, хто падаваў заяву, прычына адмовы — у антырасійскіх настроях тэлеспектакля, — паведаміў "Народнай волі" рэжысёр. — *Спасылкі на недакладнасць фільма ў параўнанні з арыгіналам бессэнсоўныя. Так, у нашай версіі не ўсё ідзе дакладна па купалаўскім тэксце. Але ж ці магчыма ў сцэнічнай або тэлевізійнай версіі твора пакінуць увесь тэкст? Сёння нават п'есы ставяцца не цалкам. Гэта адмова — абсалютна непрафесійны адказ, дадзены для адчэпкі".*

Валерый Мазынскі лічыць, што спроба зарэгістраваць "Тутэйшых" была першапачаткова няздзейснай. І тут жа дадае:

"А на халеру тая рэгістрацыя? Нават калі б "Тутэйшыя" яе атрымалі, усё роўна тэлеспектакль па кінатэатрах не пайшоў бы. Яго ўжо не раз паказалі па "Белсату". І па руках ён таксама разышоўся. Той, хто хацеў, той убачыў нашых "Тутэйшых" і без усялякай рэгістрацыі. А той, каму гэта не трэба, ніколі не ўбачыць тэлеспектакль, нават калі яго пакажуць па БТ".

Вольга ПРУДНІКАВА.

ДАРЭЧЫ

Гэта не першы незалежны фільм на беларускай мове, які забараняецца да паказу ў Беларусі. Раней той жа лёс напаткаў "Акупацыю" Андрэя Кудзіненкі, што не зашкодзіла фільму ўзяць прэстыжныя міжнародныя ўзнагароды. Поспех за мяжой мелі і фільмы дакументаліста Хашчавацкага, паказаныя ў дзесятках краін свету. Забараняліся стужкі пра Васіля Быкава.

ТЫМ ЧАСАМ

У рэпертуары Купалаўскага тэатра ні на гэты, ні на наступны месяц спектакля "Тутэйшыя" няма.

(Больш глыбокія разважанні аб прычынах забароны тэлеспектакля "Тутэйшыя" на тэрыторыі Беларусі, а таксама пра канфлікты здымачнай групы з польскім бокам падчас працы над спектаклем — у гутарцы журналіста Міхася Скоблы з рэжысёрам Валерыем Мазынскім.)

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Валерый МАЗЫНСКІ:

«Нават маленькую праяву нацыянальнай годнасці беларускія ўлады хочуць прыдушыць, прыбіць аглобляй»

Міхась СКОБЛА: — Спадар Валерый, над гэтым творам Янкі Купалы, няйначай, вісіць нейкі заклён. "Тутэйшых" за ўвесь час іх існавання забаранілі, здаецца, ужо ў шосты раз. Упершыню — у 1926 годзе, у пастаноўцы Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра; затым — у 1927-м, у трэцім томе Збору твораў народнага паэта; затым двойчы п'еса забаранялася на пачатку 1980-х гадоў — у пастаноўцы Магілёўскага драмтэатра і ў зборніку "Спадчына", які так і не выйшаў. Далей — ужо ў наш час у Купалаўскім тэатры, і нарэшце — як тэлефільм. А гэтым разам за што?

Валерый МАЗЫНСКІ: — Абвінавачваюць нас з Купалам у шавінізме. У адказе, які мы атрымалі з Дэпартамента кінематаграфіі, вельмі складаная фармулёўка. Начальнік Упраўлення рэгістрацыі і класіфікацыі кінавідэапрадукцыі спадар Курловіч піша: "У фільме скрыўляецца сэнс і мастацкая скіраванасць твора народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, што стварае ў гледача няправільнае ўяўленне пра творчасць класіка беларускай літаратуры, закранае яго годнасць. У фінальнай частцы фільма маюць месца праявы шавінізму і нацыянальнай выключнасці, што недапушчальна".

Мяне ў гэтым адказе больш за ўсё ўражвае тое, што гэта напісана не ў Маскве, а тут, і не нейкімі расійскімі чыноўнікамі, а нашымі. Чалавек, які гэта напісаў, перш за ўсё падумаў не пра тых беларусаў, якіх я "расстраляў" у двары (маю на ўвазе фінал фільма). Ён не палічыў патрэбным іх пашкадаваць, ён абвінаваціў мяне ў тым, што я гэтак паказаў палітыку бальшавікоў. Падобнае, маўляў, недапушчальна. Бальшавікі, аказваецца, не могуць страляць беларусаў. Для мяне гэта парадокс. Нас ужо ніхто не прымушае выкрываць ворагаў, мы самі сябе гатовыя дзяўбці, самі сябе вінаваціць у шавінізме. Вось гэта для мяне, прызнаюся, адкрыццё.

Дарэчы, вы забыліся яшчэ пра адну забарону "Тутэйшых". Быў зняты яшчэ адзін мастацкі фільм, які адразу ж лёг на паліцу, яго ўвогуле ніхто не бачыў. І я таксама яго не бачыў, а толькі чуў легенду пра яго. Фільм той нібыта зняў Мікола Пінігін. Мне ў Польшчы пра гэта расказалі, там яго бачылі.

СКОБЛА: — Мастацкі фільм "Тутэйшыя" на пачатку 1990-х гадоў зняў рэжысёр Панамароў. Хіба гэты твор маецца на ўвазе?..

МАЗЫНСКІ: — Панамароў? Ну, значыць, фільм Панамарова забаронены. Гэта таксама ўжо гісторыя.

СКОБЛА: — Днямі я яшчэ раз праглядзеў вашых "Тутэйшых" і так і не ўбачыў, дзе там той "шавінізм". А вы не спрабавалі высветліць, што канкрэтна меў на ўвазе Дэпартамент кінематаграфіі пад сваімі абвінавачваннямі?

МАЗЫНСКІ: — Я нават і не буду спрабаваць даведацца, што там яны мелі на ўвазе. Для мяне і так усё ясна, як Божы дзень. Нават маленькую праяву нацыянальнай годнасці беларускія ўлады хочуць прыдушыць, прыбіць аглобляй. Самі, без указанняў з Масквы ці аднекуль яшчэ. Я не думаю, што ў тым дэпартаменце сядзяць "маскалі" (як называў іх Купала), наезджыя чыны з Расіі. Там сядзяць свае дамарошчаныя забароншчыкі, якія гатовыя самі ў сябе адгрызці хвост. І пасля гэтага яны хочуць, каб "квітнела Беларусь", як панапісана паўсюль на плакатах.

СКОБЛА: — Звычайна сцэнічны ці кінематаграфічны твор мае адхіленні ад першапачатковага твора, па якім напісаны сцэнарый. А ці ёсць у вашым фільме значныя адыходы ад тэксту Янкі Купалы?

МАЗЫНСКІ: — У мяне няма ніводнай фразы, прыдуманай ад сябе. Ніводнай! Іншая справа, што не ўвесь тэкст Купалы ўвайшоў у фільм. І гэта зразумела: Купала напісаў п'есу ў чатырох дзеях. І калі толькі прачытаць увесь тэкст, то гэта зойме каля дзвюх гадзін. А працягласць фільма — гадзіна дваццаць пяць хвілін. Таму давялося скарачаць тэкст. Зразумела, што ў гэтым скарачэнні таксама выявіліся некаторыя пазіцыі мае як рэжысёра. Напрыклад, на сённяшні дзень я абсалютна не згодны з тым Янкам Здольнікам, які ёсць у Купалы. Сёння мне такі Здольнік не патрэбен. Мне патрэбен герой, хоць у нейкай ступені разумны, інтэлектуальны чалавек. Таму я скараціў увесь дробны, побытавы тэкст, які ў п'есе прагаворвае Здольнік. Шчыра прызнаюся, мне было лягчэй разважаць пра гэты персанаж, маючы на ўвазе асобу Зянона Пазьняка... Гэта лёс палітыка, які мусіць сутыкацца штодзённа з нашай "тутэйшасцю", з гэтай дэбільнасцю ў разуменні саміх сябе, у адносінах да саміх сябе... І прыйсці да пэўнага адчаю. Па сцэнічных законах герой надоўга не можа пакідаць месца дзеі. У Купалы Янка Здольнік з'язджае некуды на вёску.

СКОБЛА: — Як Пазьняк за мяжу?

МАЗЫНСКІ: — Так, як Пазьняк за мяжу. І мне вельмі шкада, што ў нас катастрафічна не хапала часу спецыяльна напісаць сцэнарый для гэтага фільма. Таму атрымаўся ўсё ж фільм-спектакль. Мы яго знялі, не паверыце, усяго за восем сутак! Здымалі па начах, без дубляў, літаральна з колаў. І знакі гэтай паспешнасці, вядома ж, засталіся ў фільме.



СКОБЛА: — Янка Купала ў фінале сваёй п'есы пакідае месца для дадумвання — у яго няма эфектнай кропкі. Бальшавікі проста арыштоўваюць Мікіту Зносака і зводзяць з хаты. І ў вас, і ў пастаноўцы Пінігіна — у фінале галоўны герой гіне. Чаму вы робіце Зносака ахвярай бальшавіцкага тэрору? Ён — фенаменальны прыстасаванец, ён жа мог прыстасавацца і да бальшавікоў?

МАЗЫНСКІ: — Як творца, я не магу сабе дазволіць, каб майго героя, нават такога, як Зносак, можна была растаптаць і расцерці дарэшты. Я пакідаю надзею, гэта маё права. Калі Купала іх усіх арыштоўвае і заводзіць у пастарунак, то мне на сённяшні дзень гэтага мала, я павінен даць працяг. Прынцыпова мне не хацелася ўздымаць у фільме беларчырвона-белы сцяг. Сцяг у мяне там мільгае ў акне, як нейкая ануча, глядач нават не паспявае разгледзець, белы ён там ці чырвоны. Увогуле, са сцягамі ў фільме ў мяне свае адносіны. Бо мне надакучыў наш глядач, які прыходзіць у Купалаўскі тэатр на "Тутэйшых" ужо пятнаццаць гадоў...

СКОБЛА: — Ужо не прыходзіць.

МАЗЫНСКІ: — Так, не прыходзіць. Але многа гадоў прыходзіў, як на дэманстрацыю, чакаючы фіналу, чакаючы ўзняцця сцяга, каб атрымаць нейкае ачышчэнне. Ён ужо не хадзіў на вуліцу, не змагаўся, а ў тэатры знайшоў сабе такую зручную сатысфакцыю. Мяне гэта раздражняла. І таму ў мяне такі фінал у фільме. Я не даю людзям надзеі, я не падымаю сцяг, я сваіх герояў проста расстрэльваю. Гэтых "тутэйшых", гэтых сваіх людзей, якіх я страшэнна люблю. Але за тое, што яны так адносяцца да саміх сябе, я іх "прыгаворваю" да такога трагічнага фіналу. У рэшце рэшт, я нічога не прыдумваю. Падобнае было ў жыцці, паўсюль у нашай гісторыі было такое. Нашыя папярэднікі пастаянна гінулі, гінулі і гінулі. Прычым гінулі самыя лепшыя, самыя разумныя, самыя адукаваныя, гінула эліта.

СКОБЛА: — Я заўважыў, што ў вас Мікіта Зносак на апошніх хвілінах выяўляе здольнасць да пратэсту. Так, ён прамаўляе тэкст Купалы, але якім тонам! Ён літаральна патрабуе ў бальшавіцкага камісара "чэк на арышт"! Вы свядома далі такую ўстаноўку акцёру Паўлу Харланчуку?

МАЗЫНСКІ: — Абсалютна свядома. Таму што я пакідаю за чалавекам права на абарону ўласнага жыцця. Калі чалавека доўга дзяўбуць у адно месца, ён проста паталагічна выкідвае з сябе энергію супраціву. І гэта натуральна. Але гэта і страшна, бо гэта бунт галоднага, бунт заціснутага ў кут.

СКОБЛА: — Вы здымалі "Тутэйшых" у Польшчы. А ў адным з эпізодаў фільма Мікіта Зносак крычыць бальшавікам: "Я разам з вамі пайду здабываць Варшаву!" Ды і Заходні вучоны (паляк) у вас, як і ў Купалы, выглядае карыкатурна. Ці не было ў вас на гэтай глебе непаразуменняў з польскім бокам?

МАЗЫНСКІ: — З польскім бокам усялякае было. Але факт застаецца фактам: я здымаў на польскія грошы, на польскай тэрыторыі фільм, у якім ёсць неадназначныя адносіны да польскасці. І я заўважыў, што і ў сённяшняй Польшчы ёсць людзі, якія глядзяць на Беларусь "па-крэсоваму". Прызнаюся, у мяне ледзь не ўзнік канфлікт на гэтай глебе — у самім фільме. У Янкі Купалы, як вы памятаеце, палякаў няма, яны прыходзяць і сыходзяць у антракце, паміж дзеямі. А ў мяне палякі прысутнічаюць, паказаны захоп імі Мінска. Ёсць эпізод, дзе польскія жаўнеры стукаюць у дзверы, зрываюць бальшавіцкі плакат са сцяны. Я хацеў яшчэ больш жорстка паказаць палякаў, але моцнае супраціўленне было з боку "тамтэйшай тутэйшасці". Напрыклад, я хацеў у захопленым палякамі Мінску падаць у іранічнай форме спяванне "Сто лят". Дайшло нават да моцнага канфлікту...

Так што, як пісаў Якуб Колас, "з двух бакоў айцы дубінай заганялі нас у рай". Але, і гэта істотна, на сённяшні дзень Польшча — дэмакратычная краіна, там усяго намешана, у тым ліку і "крэсовасць" адкрыта выяўляецца. Але факт застаецца фактам: я здымаў беларускі фільм па творы беларускага класіка на польскай тэрыторыі і за польскія грошы. І зняў яго.

СКОБЛА: — Забарона вашых "Тутэйшых", на жаль, не адзінкавы выпадак. Вы згадалі фільм Панамарова, памятаецца і аналагічная сітуацыя з фільмам Уладзіміра Кудзіненкі і Аляксандра Качана "Акупацыя". Дарэчы, гэты фільм нядаўна быў адзначаны галоўным прызам на Львоўскім фестывалі. Дык можа, і забарона "Тутэйшых" уладамі паспрыяе іх хутчэйшаму прызнанню гледачамі, як вы лічыце?

МАЗЫНСКІ: — Так заўсёды бывае: любыя забароны распальваюць цікавасць. Што ж, дай Бог, каб як мага больш людзей паглядзела "Тутэйшых". На жаль, у нас вельмі абмежаваная колькасць людзей глядзіць "Белсат", хоць ужо з двух спадарожнікаў ідзе сігнал. Што ж, будзем чакаць на рэакцыю гледачоў.

СКОБЛА: — Дэпартамент кінематаграфіі забараніў распаўсюд "Тутэйшых". Але пры сённяшніх тэхналогіях, калі на любым камп'ютэры можна зрабіць копію, няма аніякіх праблем з тыражаваннем. Іншая справа — узнікне праблема з аўтарскім правам. Як вы, як адзін са стваральнікаў фільма, паставіцеся да ягонага магчымага пірацкага распаўсюду?

МАЗЫНСКІ: — Аўтарскае права належыць не мне, а "Белсату". Фільм здымаўся на сродкі гэтага тэлеканала і цяпер з'яўляецца ягонай уласнасцю. Я нават падпісаў пэўную дамову на гэты конт. Гэта што да юрыдычных правоў. Зразумела, за мной, як за рэжысёрам, застаецца нейкае маральнае права на "Тутэйшых". А як я пастаўлюся да нелегальнага распаўсюду... Ведаеце, сёння і не такія зубры кінематографа, як Мазынскі, церпяць ад гэтага і нічога не могуць зрабіць з пірацкімі копіямі сваіх фільмаў. Так і з "Тутэйшымі". Птушачка вылецела, і яна ўжо недзе там, у атмасферы, у эфіры.

Радыё Свабода.

ПАМЯЦЬ

Тая самая Паўлінка

Янку Купалу не спатрэбілася прыдумляць імя галоўнай гераіні знакамітай камедыі "Паўлінка". Яна жыла блізу купалавай вёскі Акопы на Лагойшчыне. Але так сталася, што ведаў ён і другую Паўлінку, толькі з Мядзельшчыны, — чароўную, прыгожую, гарэзлівую, па-жаноцку вабную і моцную духам.

Падобна, яркія рысы натуры і гэтай цудоўнай беларускай дзяўчыны будучы класік увасобіў у сваім неўміручым творы. А саму Паўлінку ўгаварыў выканаць у спектаклі галоўную ролю...

Да канца жыцця ёй быў дарагі ўспамін пра той хвалюючы, поўны страху (а раптам — правал?) і небывалай радасці (столькі энтузіязму сярод гледачоў, захаплення, віншаванняў) дзень... Пастаноўка, што прайшла з велізарным поспехам на беларускай вечарынцы ў Пецярбургу, адбылася ў далёкім 1913 годзе — там Паўліна Мядзёлка з мядзельскай вёскі Будслаў вучылася на агульнаадукацыйных курсах. Яна сама адчувала сваю знітаванасць са сваёй гераіняй і ўкладвала ў сцэнічную ролю ўсю душу.

У далейшым удзельніца беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні (1914), затым Першага беларускага тэатра драмы і камедыі (1917—1918, 1920), увасобіла на сцэне Купалаву Зоську ў драме "Раскіданае гняздо", Пронку ("Хам" паводле Э.Ажэшкі). Стварала харавыя гурткі ў Гродне, Дзвінскай беларускай гімназіі і Горацкай сельгасакадэміі, выдавала беларускія падручнікі, у сваім родным Будславе настаўнічала. Яна зрабіла значны ўнёсак у наша нацыянальнае адраджэнне, была ўганаравана званнем заслужанай дзеячкі культуры Беларусі.

Мне выпаў вялікі гонар не раз сустракацца з Паўлінай Вікенцеўнай у 60-я гады мінулага веку, калі яна жыла ў Мінску. Якраз тады яна пісала кнігу мемуараў "Сцежкамі жыцця" і шмат чаго распавядала: карціны перажытага паўставалі перад яе вачыма. Асабліва запомніўся яе ўспамін пра апошнюю сустрэчу з Янкам Купалам у гасцініцы "Масква", дзе і жыла яна ў час вайны. Паэт цяжка перажываў страшную навалу, што абрынулася на родную зямлю.

— Калі я зайшла да яго, убачыла: ён вельмі зморaны, маўклівы. Паўшчувала: чаму не ўратаваў, не ўзяў з сабою архіў з палаючага Мінска? Нічога на гэта Янка не сказаў, толькі твар яго перасмыкнуўся ад болю.

А потым яна пачула жахлівую вестку пра яго гібель у гэтай жа самай гасцініцы...

Паўліна Мядзёлка, пакуль жыла ў беларускай сталіцы, трымалася Купалавага музея, брала ўдзел ва ўсіх яго імпрэзах. Прыйшла яна і на жалобную цырымонію перахавання праху народнага паэта, перавезенага з Масквы на Радзіму. Ля надмагілля на Вайсковых могілках Мінска яна была ў атачэнні маладых хлопцаў (моладзь заўсёды цягнулася да гэтай яркай асобы), адрэкамендавала іх нам:

— Гэта Купалава змена, Купалава парасль!

Больш мы не бачыліся. Паліна Вікенцеўна вярнулася ў свой родны Будслаў, дзе і скончыла сваё змястоўнае, цікавае жыццё (1893—1974). Зараз з дня яе народзінаў споўнілася 115 год. Але для нас яна застанецца вечна юнай, няўрымслівай Паўлінкай, чыё імя назаўсёды звязана з імем Вялікага народнага песняра.

Уладзімір СОДАЛЬ.

На здымку: *Паўліна Мядзёлка пецярбургскай парой.*

Аўстралійскі магнат дасць на рэстаўрацыю сінагогі ў Гродне мільён долараў

Колькі дакладна грошай спатрэбіцца на аднаўленне, пакуль не вядома, але сума дакладна перавысіць мільён долараў.

Рэстаўрацыяй удалося зацікавіць нафтавага магната з Аўстраліі, на якога выйшаў гродзенскі рабін Іцхак Копман. Бацька аўстралійца паходзіў з Гродна і нават жыў побач з сінагогай. Ён адзіны з сям'і, хто выжыў падчас Другой сусветнай вайны, пасля трапіў у Ізраіль. Пачатак рэстаўрацыі ўжо пакладзены: у Мінск на даследаванні адаслалі пробы тынкоўкі і цэглы. Гродзенскі гарвыканкам таксама паўдзельнічаў: пералічыў на праектаванне 20 мільёнаў рублёў. Заняцца гэтай працай прапанавалі інстытуту "Гроднаграмадзянпраект", але адказу пакуль не атрымалі.

ИНИЦИАТИВА

«Наше поколение» подало документы в Министерство юстиции

Прежде объединению белорусских пенсионеров пришлось заплатить 875 тысяч госпошлины, а теперь они ждут решения о регистрации.

Напомним, что это уже не первая попытка зарегистрировать на территории Республики Беларусь общественную организацию, которая отстаивала бы интересы всех без исключения пенсионеров. Первая попытка была предпринята два года назад, и об этом много писала "Народная воля". Тогда Министерство юстиции отказало инициаторам общественного объединения "Старейшины" в регистрации, а впоследствии Верховный суд поддержал это решение. С тех пор руководство организации раскололось, и все инициаторы выстраивали свою политику в отношении белорусских пенсионеров самостоятельно. Бывшие лидеры "Старейшин" публично отказались от этой деятельности. Лидеры новой организации "Наше поколение" приняли кардинальное решение работать дальше. 17 августа 2008 г. прошел учредительный съезд ООБП "Наше поколение", на котором в качестве председателя была избрана Татьяна Зелко. В правление организации вошли бывшие члены правления "Старейшин" Валерий Щукин, Владимир Багин и другие. Однако в большинстве своем организация состоит из новых инициаторов. Было также принято решение запретить занимать пост председателя и заместителя председателя членам политических партий.

Необходимо отметить, что процедура регистрации в Беларуси не только бюрократизирована, это еще и достаточно дорогое дело. Например, "Новое поколение" сдало в Министерство юстиции пакет документов, состоящий из 81 бумаги, и заплатило в общей сложности 933.270 рублей (государственная пошлина и объявление в газету).

— Мы постарались все сделать максимально приближенно к Закону "Об общественных объединениях", однако я не исключаю, что в документах могут быть какие-либо ошибки, — говорит председатель правления "Нового поколения" Татьяна Зелко. — И это будет вполне объяснимо, поскольку даже теоретически очень сложно не запутаться в самой процедуре подготовки документов в регистрирующий орган.

Когда мы создавали "Наше поколение", звучали разные советы относительно нашей публичной позиции. Например, многие советовали нам не светить "одиозных" личностей, таких как Валерий Щукин, советовали выступить с определенными тезисами в программе и позицией организации. Однако мы не пошли на это. Мы остаемся верны своим принципам, но в то же время мы хотим жить и работать исключительно в рамках законодательства и искренне надеемся на понимание со стороны государства. Мы не намерены предавать своих инициаторов или менять свою совесть на одну, пусть даже очень важную для нас, бумажку с гербовой печатью. После того, что мы уже сделали и делаем, мы, а я имею в виду себя и свою команду, уже не имеем морального права перед своими членами просто так развести руками и сказать, что останавливаем свою деятельность. Мы намерены работать при любом решении Министерства юстиции относительно государственной регистрации. У нас есть много наработок, как улучшить пенсионную систему, есть определенные связи в Европе, которые могут привлечь в Беларусь социальные инвестиции...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

СКАНДАЛ

Святлана ЗЕЛЯНКОЎСКАЯ:

«Хай прыходзяць у тэатр і глядзяць, як мы жывём...»

"Чаму ў нас такі ўбогі рэпертуар? Давайце змяняць кіраўніцтва!" — гэта цытаты з дыскусіі, якая разгарэлася днямі паміж акцёрамі і кіраўніцтвам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Каталізатарам гутаркі на павышаных танах стала рашэнне кіраўніцтва тэатра прыняць жорсткія меры ў дачыненні да Алега Гарбуза, які не з'явіўся на спектакль "Дзіўная місіс Сэвідж".

Акцёр растлумачыў, што перад спектаклем яго забрала "хуткая дапамога". Але кіраўніцтва памкнулася атрымаць з Гарбуза няўстойку за сарваны спектакль.

"Гэта было парушэнне дысцыпліны, якое не можа быць прапушчана, — абурыўся дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы **Мікалай Кірычэнка**. — *А гавораць, што была ледзь не спроба расправіцца з ім за ўдзел у здымках "Тутэйшых". Не было такога. І здымаўся ён, і ўсе ведалі, і ніхто ж яго не спыняў. Яго права — мастака..."*

"Сход быў прысвечаны менавіта гэтаму выпадку, але гаварылі мы пра гэта нядоўга, — адзначыў сам **Алег Гарбуз**. — *Пачалі ўставаць нашы акцёры і выказваць думкі наконт жыцця тэатра, што ў тэатры адбываецца, якія п'есы мы іграем, якія будзем іграць, якія рэжысёры да нас прыходзяць і хто намі кіруе..."*

Верагодна, таму што дыскусія адышла далёка ад тэмы скасаванага спектакля, на дапамогу быў закліканы галоўны ідэолаг Адміністрацыі прэзідэнта **Усевалад Янчэўскі**. Ён гутарыў з Мікалаем Кірычэнкам, а затым з адным з вядучых акцёраў тэатра — **Андрэем Гладкім**.

Наступным крокам Усевалада Янчэўскага стаў выклік у Адміністрацыю прэзідэнта трох галоўных акцёраў тэатра, якія, не бачачы перспектыў пры цяперашнім кіраўніцтве, перайшлі на паўстаўкі: **Аляксандра Малчанава, Святланы Зелянкоўскай і Ганны Хітрык**.

Аляксандр Малчанаў і Ганна Хітрык сустрэліся з Янчэўскім, а Святлана Зелянкоўская аўдыенцыю праігнаравала.

Як распавяла Святлана "Народнай волі", яна не лічыць патрэбным прымаць такія запрашэнні.

"А навошта? — здзівілася яна. — *Я актрыса і павінна іграць у тэатры, а не адчытвацца перад адміністрацыямі. Мне не зразумела, чаму выклікалі менавіта нас. Калі тэатру жадаюць дапамагчы, то хай прыходзяць у тэатр на зборы, гавораць з усімі і глядзяць, як мы жывём".*

Па словах Ганны Хітрык, асноўнае, што цікавіла Янчэўскага, — чаму акцёры сталі працаваць у тэатры на палову стаўкі.

"Я сказала, што з нашымі заробкамі жыць "цудоўна", але ёсць і творчыя праблемы, — растлумачыла Хітрык. — *Ёсць спектаклі, якія проста не могуць ісці ў рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага тэатра. А праз тое, што яны ідуць, мы робім нашага гледача грубейшым, злым і тупым".* Усевалад Янчэўскі паабяцаў разабрацца ў сітуацыі і дапамагчы.

Ці былі зроблены гэтыя абяцанні толькі для заспакаення трупы або Адміністрацыя прэзідэнта сапраўды зоймецца праблемамі Купалаўскага тэатра? Што зменіць такое ўмяшанне ў тэатральнае жыццё краіны? "Народная воля" будзе сачыць за развіццём сітуацыі ў Купалаўскім тэатры.

ТЫМ ЧАСАМ

«А ці ведае сапраўднае становішча рэчаў у нашым тэатры Міністэрства культуры?..»

Як высветлілася, яшчэ да цяперашняга канфлікту актрыса Алена Іваннікава напісала ліст у Адміністрацыю прэзідэнта аб бядотным становішчы ў тэатры, убостве рэпертуару, сыходзе галоўных акцёраў і мізэрных зарплатах. Пасля збору трупы і наступнымі за тым гучнымі падзеямі вакол тэатра тэкст ліста стаў вядомы і журналістам.

"Ні аднаго акцёра нашай трупы не задавальняе невыразная палітыка кіраўніцтва тэатра, — *заяўлялася ў лісце.* — Акцёры, якія некалі ярка заявілі пра сябе, праявілі на сцэне тэатра вялікі талент, пятнаццаць-дваццаць гадоў не выходзяць на сцэну ў новых ролях. Ды і няма чаго ім больш на ёй рабіць! Акцёр гаворыць з людзьмі праз аўтара п'есы і пастаноўшчыка, а самыя лепшыя акцёры нашага тэатра не знаходзяць у тэатры ні добрай п'есы, ні добрай рэжысуры! А ці ведае сапраўднае становішча рэчаў у нашым тэатры Міністэрства культуры? Не? Тады навошта яно? А калі ведае? Тады чаму ўсё так, як ёсць?.."

Актрыса адзначыла, што салідарна з гледачом, які перастаў разумець тэатр.

"Гледачы са здзіўленнем пакідаюць залу з думкамі: пэўна, я не дарос, не разумею нічога ў мастацтве, — *напісала Іваннікава.* — Нам, акцёрам, таксама прэсна ад большасці нашых спектакляў. Хочацца пасля іншага спектакля сказаць гледачу — прабачце, мы вас падманваем, гэта даўно не тэатр і не мастацтва!"

Напрыканцы ліста актрыса папрасіла дапамогі ў прэзідэнта і прапанавала стварыць экспертную камісію для пераацэнкі тэатральнага жыцця.

"А дашліце каго-небудзь са сваіх памагатых пагаварыць з трупай! — *эмацыянальна скончыла яна.* — А давайце створым незалежную экспертную камісію з ліку мастацтвазнаўцаў Расіі, краін Балтыі, Украіны — дзе тэатральнае мастацтва знаходзіцца на найвышэйшым узроўні..."

Акцёры тэатра не жадаюць быць «звяркамі»

Акцёры тэатра, нягледзячы на пазіцыю кіраўніцтва, спадзяюцца на хоць якія-небудзь змены ў сваім жыцці пасля ліста Іваннікавай, сходу трупы і размове Маўчанава і Хітрык з Янчэўскім. Таму што сённяшняе становішча не задавальняе нікога з іх.

"З тэатра зрабілі невядома што — ён перастаў быць домам для кожнага з нас, — *расказаў Алег Гарбуз.* — Калі прыходзіць вахцёр і кажа: "Ужо адзінаццаць, давайце вымятайцеся!", — хто галоўны ў тэатры? І так пакрыху нас адсунулі, і акцёр стаў апошнім чалавекам. У некаторых падраздзяленнях нашага тэатра нас называюць "нашы звяркі"...

Нашы акцёры незадаволены — тэатр не дае пэўнай матэрыяльнай стабільнасці. Яшчэ і ў творчым плане досыць праблемна: у нас да тэатра ставяцца як да нечага другараднага ".

Валерыя ЕСІНА.

МЕРКАВАННЕ

Няма «жывых беларусаў»

"Купалаўскі тэатр не зрабіў усяго таго, што павінен рабіць нацыянальны тэатр, — лічыць рэжысёр і кіраўнік "Вольнага тэатра" Мікалай Халезін. — У яго ёсць вызначаныя абавязкі перад краінай — падрыхтоўка новых спецыялістаў, развіццё нацыянальнай сучаснай драматургіі і рэжысуры. Калі мастацкі кіраўнік кіруе тэатрам больш за 30 гадоў, ён проста не ў стане разумець, куды трэба рухацца. Ён наогул не чытае сучасных п'ес, ён не ведае, што гэта такое. У Купалаўскім тэатры практычна няма п'ес пра жывых беларусаў!"

Кіраўніцтва Купалаўскага лічыць, што «ні бунту, ні канфлікту не было»

"Гэта была прыпозненая, але нармальная гутарка з калектывам па праблемах — творчых, рэпертуарных, тэхнічных, жыццёвых, — *выказаў сваё бачанне сітуацыі дырэктар тэатра імя Янкі Купалы Мікалай Кірычэнка.* — Гутарка была адкрытай: і я, і мой мастацкі кіраўнік выслухалі шмат непрыемных, але справядлівых рэчаў. За гэтую падзею я нясу адказнасць і прызнаю сваю бездапаможнасць, няўважлівасць, нават віну. Але гэта не было ні бунтам, ні канфліктам... Вінаваціць можна толькі нас, кіраўнікоў, а не тых, хто выйшаў і выказаўся. Думаю, тое, што яны гаварылі, трэба плаўна, без скандалаў вырашаць".

КАЛЕЙДАСКОП

Упрыгожаны кветкамі трамвай і п'еса самазабойцы

Фестываль студэнцкіх тэатраў "Тэатральны куфар" адкрыўся дзіўным перформансам "Трамвай "Жаданне": з трамвайнага кольца на Камсамольскім возеры выехаў трамвай, упрыгожаны фарбамі, стужкамі, паветранымі шарамі і тэатральнымі маскамі.

Ён прытрымліваўся свайго звычайнага маршруту, але на кожным прыпынку яго сустракалі незвычайныя пасажыры — удзельнікі фестывалю, якія выступалі з самапрэзентацыяй.

У рамках фэсту прайшоў паказ скандальнага спектакля "Псіхоз 4:48", па п'есе **Сары Кейн**, якая пакутавала на маніякальна-дэпрэсіўны псіхоз і пакончыла з сабою, дапісаўшы гэтую п'есу. Лічбы ў назве п'есы — дакладны час самазабойства Сары.

Француз будзе ўсхваляць будучыню ў Мінску

У сталіцы адкрыецца выстава фатаграфій Антуана Ганена "Усхваленне будучыні", арганізаваная пры падтрымцы Амбасады Францыі ў Беларусі.

Парыжанін Антуан Ганен, які звярнуўся да фатаграфіі яшчэ ў юным узросце, паспеў папрацаваць у якасці незалежнага фатографа для буйных французскіх і еўрапейскіх прадпрыемстваў.

У 2000 годзе ён апублікаваў сваю першую кнігу "Усхваленне будучыні", якая стала вынікам шасці гадоў працы на тэму французскай індустрыі высокіх тэхналогій. *Адкрыццё адбудзецца ў Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэцы 15 кастрычніка ў 17.00. Выстава працягнецца да 28 кастрычніка.*

У Гомелі адкрыецца кафэ для вегетарыянцаў

У новым кафэ наведвальнікам будуць прапанаваны гарачыя і халодныя стравы, закускі, салаты, прыгатаваныя з агародніны, а таксама свежавыціснутыя сокі.

Пры гэтым спецыялісты абяцаюць, што меню будзе вельмі разнастайным. Напрыклад, толькі з рэпчатай цыбулі ў кафэ прапануюць не меней за 30 арыгінальных страў.

Наведвальнікі змогуць не толькі падсілкавацца, але і запісаць рэцэпты.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Што значыць быць беларусам?

З кастрычніка пачалася агульнабеларуская кампанія "Будзьма!", ініцыятары якой заклікаюць усіх неабыякавых суайчыннікаў адказаць для сябе на пытанне, вынесенае ў загаловак, і зрабіць свой унёсак у супольную будучыню.

"За 17 год існавання незалежнай Беларусі не створаны падмурак для кансалідацыі беларускага народа, хаця такія працэсы ўжо прайшлі ва ўсіх краінах былога Савецкага Саюза, — тлумачыць прычыны заснавання новай адкрытай грамадска-культурнай кампаніі "Будзьма" яе каардынатар **Алена Макоўская**. — *Мы збіраемся аб'яднаць беларусаў на глебе павагі да сябе, беларускай гісторыі, мовы і культуры. Мы хочам, каб усе ўсвядомілі, што беларуская культура — гэта сучасна, модна і перспектыўна".*

Ініцыятарамі кампаніі "Будзьма" выступілі больш за 10 грамадскіх арганізацый і ўстаноў Беларусі. Сярод іх — "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", ГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў", ГА "Таварыства беларускай мовы", суполка "Пагоня", створаная пры Саюзе мастакоў, творчы калектыў альманаха "pARTisan", ГА "Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры" і іншыя.

"*Адна справа мець шыльду "Мы — беларусы", пад якой пачынаюцца і тут жа заканчваюцца акцыі,* — мяркуе старшыня суполкі "Пагоня" пры БСМ **Аляксей Марачкін**. — *Іншая справа — мець такую кампанію, як "Будзьма", якая дапаможа нам быць свядомымі і адукаванымі".*

"Сваім удзелам у кампаніі "Будзьма" ТБМ хоча звярнуць увагу на падзею, якая чакае Беларусь праз год — перапіс насельніцтва, — паведаміў **Алег Трусаў**. — *Ні ў адной цывілізаванай краіне ў складзе пытанняў да перапісу няма такога, як "На якой мове вы размаўляеце дома?". Ён ёсць толькі ў нас і ў афрыканскіх дзяржавах. Спадзяюся, что "Будзьма" дапаможа нашым людзям належным чынам падрыхтавацца да перапісу, каб яны ведалі, што яны беларусы, а іх мова — беларуская".*

У планах кампаніі выпуск трох відаў складанак сучаснай беларускай музыкі "Будзьма The Best", лекцыі па беларускай гісторыі і культуры, канцэрты беларускіх музыкаў і гуртоў, мастацкія выставы, сустрэчы з пісьменнікамі, прэзентацыі кніг, часопісаў і музычных праектаў.

Пачаў працу і сайт кампаніі www.budzma.org, які стане агульнадаступнай пляцоўкай для людзей, арганізацый і ініцыятыў, што займаюцца папулярызацыяй і развіццём беларускай культуры.

"На працягу стагоддзяў наша грамадства дзялілі — па палітычных, моўных прыкметах, па веравызнанні і сацыяльным стане, — разважае каардынатар кампаніі "Будзьма" **Ніна Шыдлоўская**. — *Спробы аб'яднаць наша грамадства былі, але рабіліся яны на палітычнай глебе. Можа, там і атрымлівалі паразы. Мы перакананыя, што аб'ядноўвацца трэба не на часовых, а на вечных паняццях — на культуры.*

У нашай кампаніі няма тэрмінаў заканчэння. Мы збіраемся падштурхнуць беларускае грамадства да самаадукацыі. І спадзяёмся, як снежны ком гэты працэс пойдзе далей".

Вольга ПРУДНІКАВА.

УВАГА!

У рамках акцыі "Дзесятачка" напрыканцы гэтага года кожны студэнт або школьнік, атрымаўшы адзнаку "10" па беларускай мове або літаратуры, атрымае падарунак ад кампаніі "Будзьма". За акцыяй можна сачыць на сайце www.moladz.org.

АНОНС

Бліжэйшыя мерапрыемствы кампаніі:

10—12 кастрычніка ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Йаханеса Рау (г.Мінск, пр-т Газеты "Правда", 11).

11 кастрычніка — гурт Mauzer выступіць у Віцебску.

12 кастрычніка — МГА "Гісторыка" запрашае на экскурсію па Мінску "Менск і прадмесьці".

18—19 кастрычніка — экскурсія "Віцебск—Полацк—Мёры—Браслаў—Віцебск".

18 кастрычніка — ГА "Беларускае добраахвотнае таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры" запрашае на лекцыю ў Лідзе "Лідчына" (касцёл і магіла жаўнераў АК у Нецечы, касцёлы ў Вавёрцы, Белагрудзе, Крупава, сядзібы ў Тарнава, Нецечы, царква і сядзіба ў Дзікушках).

ШОУ

Скрипку Страдивари везут в Минск четыре охранника

24 октября на площадке Дворца спорта будет представлено феерическое шоу на льду "Золотой лед Страдивари".

Олимпийский чемпион, трехкратный чемпион мира, пятикратный чемпион Европы — это лишь немногие из имеющихся за плечами **Евгения Плющенко** титулов. Именно он под живой аккомпанемент в исполнении венгерского скрипача **Эдвина Мартона** будет совершать виртуозные маневры на глазах минских зрителей.

Помимо именитого фигуриста, на столичной арене выступят известнейшие спортсмены мира: **Сурия Бонали, Наоми Ланг, Петр Чернышев** и многие другие. Также в программе — огненные жонглеры, ледовые акробаты, хула-хупы и невообразимое лазерное шоу.

Ледовое шоу будет состоять из двух отделений. В первом акте ледовой феерии под живой аккомпанемент в исполнении Эдвина Мартона выступят самые известные фигуристы нашей планеты. Во втором — выйдут акробаты и жонглеры с хула-хупами, лентами, шарами.

Впервые Беларусь увидит уникальный номер "Laserman" в исполнении артиста **Вадима Савенкова**, который волен превращать лазерный луч в самые невероятные вещи: фонтан, конус, куб.

Шоу первого отделения будет происходить под живой аккомпанемент знаменитой скрипки Страдивари, которая стоит 2 миллиона долларов. Драгоценную скрипку по дороге в Минск будет сопровождать четыре охранника.

"Я очень рад, что у нас появилась возможность показать выступление белорусской публике! — поделился Евгений Плющенко. — *Мы столько сил положили на это шоу, и оно получилось действительно стоящим".*

Где: Дворец спорта.
Когда: 24 октября, 19.00.
Цена билетов: 65.000 — 210.000 белорусских рублей.

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ

Сеанс здоровья от Леонида Путырского

На днях в столичном кинотеатре "Центральный" под руководством профессора-онкомаммолога Леонида Путырского прошла просветительская акция под названием "Сеанс здоровья".

Сегодня во всем мире большое внимание уделяется профилактике рака груди у женщин. Многие мировые бренды часть денег от продаж направляют в онкологические центры. В Беларуси такое спонсорство не в моде. Хотя и у нас количество заболевших заставляет задуматься. Если раньше в год заболевало приблизительно 500 женщин, то теперь диагноз "рак молочной железы" ставится приблизительно 3 тысячам женщин.

Во время "Сеанса здоровья" присутствующим показали научно-популярный фильм "Надежда", рассказывающий об истории двух женщин, заболевших раком груди. Одна из них пошла к врачу на лечение, другая решила, что и сама сможет справиться. Финал понятен: вторая женщина умирает. В фильме дается подробная информация о развитии рака и методах его лечения, о банальных ошибках и о недоверии людей. Фильм основан на реальных жизненных историях. Интересно, что главная героиня, которой дается шанс жить, сразу же согласилась сниматься, хотя актеры очень суеверны. Дело в том, что сама актриса столкнулась с такой ситуацией: ее лучшая подруга умерла от рака.

Как рассказал сам Леонид Путырский, цель фильма и акции — объяснить женщинам, как предотвращать болезнь, а если же она появилась — как с ней прожить долгие и счастливые годы.

"Большинство женщин приходят к нам в больницу на поздних стадиях болезни, — говорит Путырский. — *И поэтому нам не всегда удается помочь. А ведь женщина — это лучшее создание в мире. И когда она умирает, ничего не может быть ужасней".*

Вести мероприятие известному профессору помогала жена главы Администрации президента, актриса театра и кино **Вера Полякова**. Среди присутствующих были замечены телеведущая **Светлана Боровская**, актриса **Татьяна Мархель**, недавно избранный депутат Палаты представителей актриса **Светлана Суховей**, худрук Белгосфилармонии **Юрий Гильдюк** с очаровательной спутницей. Было сказано, все они лично и давно знакомы с онкомаммологом Путырским.

Кстати, в ближайшем будущем фильм "Надежда", созданный по идее Леонида Путырского, можно будет посмотреть и по телевидению.

Лилия ВОЛКОНСКАЯ.

БОМОНД

Актрис из США и Австралии не впустили в Беларусь

Американской актрисе и певице Стефани Пан и австралийской актрисе Эстер Мугамби, прилетевшим в Беларусь по приглашению белорусского "Свободного театра", запретили въезд в страну. Стефани Пан и Эстер Мугамби должны были в течение недели репетировать спектакли белорусского "Свободного театра" в рамках проекта "Eurepica".

Девушки ранее ни разу не посещали Беларусь. Сотрудники минского аэропорта не сообщили актрисам причину запрета на въезд в страну, ссылаясь на то, что это "конфиденциальная информация МИД РБ".

Только после 20 часов нахождения в так называемых, комнатах для задержанных перемещенных лиц Стефани Пан и Эстер Мугамби смогли вылететь через Прагу в Амстердам.

"Тяжело предположить, что нынешняя власть боится иностранных актеров, — заявил руководитель "Свободного театра" **Николай Халезин**. — *Актрисы за свой счет купили билеты и прилетели в Минск. Почему они внесены в список невъездных, не понятно. Можно предположить, что из-за того, что они сотрудничают со "Свободным театром".*

Вера ПУЛИХОВА.

ЗОРКІ Ў ГАСЦЯХ У «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Першы трэнер бронзавага прызёра Алімпіяды ў Пекіне Міхаіла Сямёнава Анатоль КАСАЎЦАЎ:

«Прасцей "спісаць" чалавека, чым паверыць у яго сілы...»

Для 24-гадовага мінчаніна Міхаіла Сямёнава прайшоўшая ў Пекіне Алімпіяда стала сапраўды трыумфальнай — з Кітая наш барэц грэка-рымскага стылю прывёз бронзавы медаль. Праўда, мала хто ведае, што яшчэ год таму некаторыя спартыўныя функцыянеры гатовы былі "спісаць" Мішу як бесперспектыўнага... На Сямёнаве збіраліся паставіць крыж...

Калі б не вера ва ўласныя сілы, калі б не падтрымка сяброў па нацыянальнай зборнай, калі б не парады першага трэнера Мішы Анатоля Касаўцава, Беларусь запраста магла б недалічыцца аднаго алімпійскага медаля.

І напэўна, толькі сам Міша Сямёнаў ведае, якія маральныя высілкі спатрэбіліся яму для таго, каб пераможыць "траўлю" і ісці да свайго галоўнага на сённяшні дзень поспеху — алімпійскай "бронзы".

...У барцоўскай зале, што размяшчаецца на сталічным стадыёне "Дынама", мне пашчасціла застаць і першага трэнера маладога беларускага барца Анатоля Іванавіча Касаўцава, і самога спартсмена. Пакуль Сямёнаў праводзіў перадтрэніровачную размінку, расказаць пра свайго выхаванца пагадзіўся трэнер:

— У барацьбу Міша трапіў, калі яму было 11 гадоў, — узгадвае Анатоль Іванавіч. — Менавіта ў гэтым узросце трэнеры і набіраюць дзяцей для заняткаў. Спасцігаць азы барацьбы будучы прызёр Алімпіяды пачаў у паўпадвальным памяшканні на сталічнай вуліцы Маякоўскага, дзе дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, у якой я тады працаваў, здымала памяшканне... Калі Міша падрос, пагутарылі з ім наконт працягу спартыўнай кар'еры. Ён паступіў у Рэспубліканскае вучылішча Алімпійскага рэзерву, дзе з ім стаў займацца вядомы трэнер Барыс Дзмітрыеў.



— Менавіта вучылішча алімпійскага рэзерву стала для Мішы мостам у вялікі спорт. Яго заўважылі трэнеры нацыянальнай зборнай. Аднак, як вядома, не ўсё на шляху вашага выхаванца было гладка. У свой час Мішу збіраліся "спісаць" як бесперспектыўнага....

— Для мяне гэта вельмі балючая тэма... Таму што я — чалавек, які аддаў барацьбе не адзін год, ніколі не змагу зразумець, чаму чэмпіёна краіны, а Міша ім быў, не выклікалі ў зборную каманду для ўдзелу ў чэмпіянаце свету... А такое здаралася!

— Шчыра кажучы, мне даводзілася чуць наступнае меркаванне: маўляў, Сямёнаў — бесперспектыўны, таму што ніякіх годных вынікаў, якраз-такі на міжнароднай арэне...

— Дык не ўсё ж адразу! Бяда ў тым, што некаторыя спартыўныя функцыянеры патрабуюць ад трэнераў і спартсменаў імгненнага выніку. А так не бывае. Для таго, каб узровень спартсмена павышаўся, яму неабходна ездзіць і выступаць, у тым ліку і на міжнароднай арэне. Так, напачатку ў Мішы не было выніку — яго прозвішча было ў выніковых пратаколах чэмпіянатаў свету і Еўропы ў трэцім дзесятку... І многія і сапраўды загаварылі аб тым, што Сямёнаў выступае ў "бесперспектыўнай" вазе... Мяне папракалі, што на Сямёнава трацяцца бюджэтныя грошы, а выніку няма...

— Зараз Міша выступае ў вагавай катэгорыі да 66 кілаграмаў. Няўжо ў нашай барцоўскай школы ніколі не было традыцый менавіта ў гэтай вазе?

— Гісторыя якраз-такі сведчыць пра адваротнае! Менавіта адносна "лёгкія" вагавыя катэгорыі і прыносілі нам славу. На Алімпійскіх гульнях у Атланце гродзенец Аляксандр Паўлаў заваяваў сярэбраны медаль, выступаючы ў вагавай катэгорыі да 48 кілаграмаў. Яшчэ адзін "грэка-рымлянін" Барыс Радкевіч стаў чэмпіёнам Еўропы 2001 года ў вагавай катэгорыі да 55 кілаграмаў. Віталь Жук у вагавай катэгорыі да 66 кілаграмаў быў прызёрам першынства Еўропы...

Ведаеце, у чым адрозненне Беларусі ад усяго астатняга свету? За мяжой маладога спартсмена гатовы вазіць на розныя прадстаўнічыя турніры цягам пяці, а то і сямі гадоў. І там спартсмену дастаткова толькі аднойчы "выстраліць". А ў нас жа чакаць не любяць. Прасцей "спісаць" чалавека, чым паверыць у яго сілы...

— Анатоль Іванавіч, напэўна ж, і Міша адчуваў, што яго гатовы "выкінуць" з вялікага спорту. Як ён вытрымаў "траўлю"?

— Пра гэта вы лепш у яго спытайцеся... Шчыра кажучы, яшчэ год таму будучае Мішы ў спорце было нявызначаным. Яму тады нават стаўку спартсмена зборнай краіны не давалі. А гэта няшчасныя 300 тысяч... Ну і за што маладому чалавеку жыць?

І зразумела, Міша тады мог зламацца...

Пра што казаць, калі яшчэ год таму на чэмпіянат свету, які праходзіў у кітайскім Гуанч Жоу, кіраўніцтва зборнай не хацела браць Сямёнава... Маўляў, мы не будзем траціць на яго грошы, бо ўсё роўна не будзе выніку. У Кітай Сямёнаў усё ж такі паехаў, грошы знайшлі праз сталічную школу вышэйшага спартыўнага майстэрства... І можа быць, дзякуючы гэтаму на Алімпіядзе ў Пекіне яму было прасцей адаптавацца...

Я вам скажу, што Міша з дзяцінства быў мэтанакіраваным чалавекам. Можа быць, гэта яму і дапамагло вытрымаць ціск. Справа ў тым, што Міша ніколі не хапаў зорак з неба. Ён быў звычайным "працоўным конікам", з кожным месяцам дадаючы крок за крокам...

А яшчэ ён у юнацтве быў вельмі ўпартым, любіў паспрачацца. Ведаеце, любую трэніроўку я распачынаю з гульнявых відаў спорту — футбола баскетбола... А вось Сямёнаву падабаецца валейбол. І я вам скажу, што Сямёнаў да хрыпаты спрачаўся за кожнае разыгранае ачко... Думаю, што менавіта ягоная спартыўная злосць, вера ва ўласныя сілы і жаданне дасягнуць мэты ў рэшце рэшт і далі плён — Міша стаў бронзавым прызёрам Алімпіяды. Прыемна тое, што з заваяваннем медаля яго павіншавалі і тыя, хто калісьці вырашыў, што на Сямёнаве прасцей паставіць крыж...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Белорусские грации выиграли Кубок мира

Сборная Беларуси по художественной гимнастике выиграла финал Кубка мира, проходивший в испанском Бенидорме. Наши соотечественницы завоевали первое место в групповых упражнениях со скакалками, а также с обручами и булавами.

В первый соревновательный день гимнастки разыграли места в упражнениях с тремя обручами и двумя булавами. Белорусские грации заняли первое место (17,650 баллов). На второй позиции расположились испанки — 16,500, на третьей — украинки (15,675).

На следующий день наши спортсменки вновь превзошли соперниц. В упражнениях с пятью скакалками белоруски набрали 17,500 баллов и опередили команды Испании (16,450) и Украины (15,775).

Блаттер против

Президент ФИФА Зепп Блаттер признался, что не понимает решения УЕФА об увеличении числа участников финальных турниров чемпионатов Европы с 16 до 24 команд.

"Я не очень обрадовался, когда эта идея была принята, — отметил Блаттер. — Теперь чуть ли не половина членов УЕФА смогут отобраться в финальную стадию чемпионата Европы. Мне кажется, что это абсурд". Как сообщает www.sport-express.ru со ссылкой на Sport1.de, президент ФИФА также подверг критике реформу еврокубков.

Аляксандр Глеб пакуль не ведае, ці згуляе ён за зборную Беларусі супраць Англіі

Паўабаронца беларускай футбольнай зборнай і іспанскай "Барселоны" Аляксандр Глеб пакуль не ведае, ці здолее выйсці на поле ў адборачным матчы чэмпіянату-2010 супраць каманды Англіі, які пройдзе 15 кастрычніка на мінскім стадыёне "Дынама".

"Аднаўленне ідзе хутка, але дакладна сказаць пакуль не магу, ці здолею выйсці на поле. На 100% я цяпер не гатовы. Ёсць план, паводле якога я буду працаваць. Усё будзе залежаць ад таго, наколькі паспяховым будзе далейшае выздараўленне", — зазначыў А.Глеб на прэс-канферэнцыі ў Беларускай федэрацыі футбола.

"На сённяшні дзень стан Глеба такі, што ён не можа гуляць", — заявіў галоўны трэнер зборнай Бернд Штанге. Паводле яго слоў, урачы "Барселоны" робяць усё магчымае, каб як мага хутчэй вярнуць футбаліста ў строй. 8 кастрычніка беларуская каманда вылецела на збор у нямецкі Руйт, а Глеб вярнуўся ў Іспанію, дзе будзе праходзіць далейшую рэабілітацыю. У канцы тыдня А.Глеб павінен зноў далучыцца да нацыянальнай зборнай. "Калі ўрачы дазволяць, магчыма, Глеб зможа ўзяць удзел у падрыхтоўцы да матча", — сказаў Б.Штанге.

13 верасня А.Глеб атрымаў траўму левай шчыкалаткі ў матчы іспанскага чэмпіянату "Барселона"—"Расінг". Паводле заключэння ўрачоў, для аднаўлення яму спатрэбяцца тры-чатыры тыдні.

Мирный стал юристом

31-летний белорусский теннисист Максим Мирный закончил пятилетнее обучение в Белорусском государственном университете и получил степень юриста. В качестве специализации теннисист выбрал тему "Международная защита прав детей".

"Работая в качестве Посла доброй воли UNICEF в Беларуси и принимая участие в различных международных и национальных детских программах, я понял, как важно продолжать действовать в направлении помощи детям, предоставления им повышенного внимания и заботы для того, чтобы обеспечить миру лучшее и более безопасное будущее", — приводит слова Мирного Tennis Week.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Далучайцеся!

Паколькі гэты нумар "Народнай волі" выйшаў павялічаным тыражом, то не выключаем, што многім з вас, шаноўныя чытачы, наша газета трапіла ў рукі ўпершыню.

Прапануем не разлучацца і надалей!

Каб у будучым мець магчымасць чытаць цікавыя матэрыялы "Народнай волі", зрабіце **перадаплату** за будучыя нумары ў бліжэйшыя дні. Рэдакцыя мае магчымасць даслаць Вам усе нумары за першы тыдзень кастрычніка.

Для тых, хто ўпершыню вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", інфармуем: пералічыць грошы можна праз любы філіял "Беларусбанка" ці праз паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апаратыўна зрабіць аплату таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць аплату за любы тэрмін і па любым адрасе. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары, якія выйдуць у кастрычніку — снежні — зрабіце гэта за месяц, два...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па аплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць **перадаплату**, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што **перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное— подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное— подчеркнуть)*

дом ___ *а,б,в,г* **корп.** ___ **кв.** ___

(Примечание: если можете— укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Дабрачынная акцыя — падпіска былым вязням сталінскіх лагераў

Ці памятаем мы нашых папярэднікаў, якія марылі і змагаліся за вольную, незалежную, беларускую Беларусь, цярпелі за яе здзекі і пакуты ў сталінскім ГУЛАГу? Сёння яшчэ дажываюць свой век нешматлікія з тых змагароў, з кожным днём па адным адыходзячы ў вечнасць. Яны ўжо не могуць стаць поплеч з намі ў першых шэрагах шэсцяў, як рабілі гэта яшчэ 10—20 гадоў таму, і цяпер адзіная магчымасць ім не парываць сувязі з намі — гэта незалежныя газеты і радыё. Кожны нумар і кожную перадачу яны чакаюць як свята, каб даведацца, як жывуць і што робяць іх наступнікі, прапускаючы праз свае і без таго збалелыя сэрцы кожную падзею з беларускага жыцця, асабліва калі некаму пагражае паўтарыць іхні лёс, стацца вязнямі сумлення.

Сябры аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" ўжо больш за год праводзяць дабрачынную акцыю падпіскі былых вязняў ГУЛАГа на газету "Народная воля". Мы прапануем усім неабыякавым людзям далучыцца да гэтай акцыі і **ахвяраваць грошы на падпіску былых вязняў сталінскіх лагераў на газету "Народная воля"**. Тыя, хто ахвяруць на месячную падпіску, змогуць атрымаць у падарунак новую версію дыска **"Пакаяньне"**.

Для ўдзелу ў акцыі вы можаце звязацца з каардынатарам праз **e-mail: represii@gmail.com** ці па тэлефонах **307-27-13/571-26-11**.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 08.10.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 28 026 экз. Заказ №